ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дармовым дадаткам „Прафрух")

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 іншагародніх абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Зьмяш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—21 г. бярэцца 10 проц. зьдачку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЭЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

Москва, В-ко ВСНК СССР
Выд. студ. сьпіс

ЭЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсэктар	13-80
Сэктар інфармацыі	13-80
Начны рэдактар	6-42
Галоўная канторa	7-81
Аддзел падпіскі	7-81
„ абвестак	7-81

ПЯТНІЦА, 7 лістапада 1930 г.
№ 261 (3859)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

ВЫШЭЙ СЬЦЯГ ЗМАГАНЬНЯ ЗА ПЕРАМОГУ САЦЫЯЛІЗМУ!

ТОЛЬКІ Ў НЕПАРУШНЫМ САЮЗЕ З ПРАЦОЎНЫМІ ЎСЯГО САВЕЦКАГА САЮЗУ БССР, ПАД КІРАЎНІЦТВАМ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ, ДАСЯГНУЛА ВЯЛІЗАРНЫХ ПОСЬПЕХАЎ У ГАСПАДАРЧЫМ І НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ

У XIII гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі Савецкая Беларусь, выступае, як надзейны фарпост СССР, на мяжы з капіталістычным Захадам

Да новых баёў, да далейшых перамог

пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК Усе КП(б)!

Мінуўшыя трынаццаць год з моманту захвату пралетарыятам улады былі для перамогшай у СССР пралетарскай рэвалюцыі гадамі няўхільнага руху ўперад. На сваім шляху пралетарыят, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і яе ленінскага ЦК, перамагаў вялізарнейшыя цяжкасьці, зьвязаныя з гаспадарчай разрухай і шалёным супраціўленьнем клясавых ворагаў, якія, апіраючыся на ўсю магутнасьць міжнароднага імпэрыялізму ня раз пераходзілі ў атаку. Гэтыя атакі як прамыя, так і захаваныя, замаскаваныя атрымлівалі і атрымліваюць руйнуючы адпор. На 13-м годзе пралетарскай рэвалюцыі мы змаглі прыступіць да выкарчоўваньня карэньня капіталізму, да ліквідацыі кулацтва як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі.

Прайшоўшыя з дня кастрычніка 1917 году гады адзначаліся, у той-жа час, ліхаманнавымі пошукамі міжнароднай буржуазіі выхаду з пасьляваеннага крызісу. Буржуазія ўвесь цяжар пасьляваеннага крызісу звальвала на плечы працоўных мас.

Буржуазія імкнулася, шляхам абвастрэньня капіталістычнай эксплёатацыі стабілізаваць, умацаваць і ўзмацніць прагніўшую капіталістычную сыстэму. Але усе гэтыя спробы буржуазіі пацярпелі поўны і безнадзейны крах. Жорсткі эканамічны крызіс патрасае капіталістычны сьвет. Расьце беспрацоўе сярод мільённых рабочых мас, расьце гапеча, узмацняецца рэвалюцыйная энтыўнасьць рабочай клясы і эксплёатуемых прыгнечаных мас сялянства. Супроць капіталістычнага ўціску падымаюцца мільённыя масы працоўных у мэтраполіях і ў калёніях. Эканамічны крызіс у радзе краін перарастае ў палітычны крызіс. Буржуазія бачыць адзіны шлях выратаваньня капіталістычнай сыстэмы ў абвастрэньні тэрору ў адносінах да працоўных і эксплёатуемых мас і ў падрыхтоўцы ваеннага нападу на СССР з мэтай загасіць вогнішча сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі. Перад тварам нарастаючай хвалі пралетарскай рэвалюцыі, буржуазія ўсё энэргічней перабудоўвае свой дзяржаўны апарат прычнечаньня ў напраму яго фашызацыі, з мэтаю падняцьця яго баяздольнасьці. Буржуазія ад мэтадаў хлусьлівай буржуазнай дэмакратыі, якая прыкрывае дыктатуру буржуазіі, пераходзіць да адкрытых форм гэтай дыктатуры.

У падрыхтоўцы да ваеннага нападу на краіну пралетарскай дыктатуры, ролю пачынальніка адыгрывае фашысцкая кліка, якая стаіць на чале кіруючай клясы фашысцкай Польшчы. Каб забясьпечыць сабе тыл, фашысцкая кліка ў Польшчы вядзе шалёную атаку на рабочую клясу і асноўныя сялянскія масы як Польшчы, так і Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі. Буржуазія прабуе параліжаваць рэвалюцыйную энэргію пралетарыяту і ўсёй працоўнай масы, а таксама параліжаваць рэвалюцыйную энэргію нацыянальна - вызваленчага руху народаў, якія прыгнечаны польскім імпэрыялізмам.

Заходняя Украіна зьяўляецца месцам шалёнага разгулу фашысцкага тэрору, які там перарос у сапраўдную грамадзянскую вайну. За апошні час разгул фашысцкага тэрору, перарастаючага ў грамадзянскую вайну, пачынае ахапляць і Заходнюю Беларусь. Арышты рэвалюцыйных рабочых і сялян, закрыцьцё прафэсыянальных арганізацый пралетарскіх і культурна-асьветных арганізацый, якія стаяць на глебе нацыянальна-вызваленчага руху, зьяўляецца мэтадам „заспакаеньня" бурлячых „крэсаў".

У той час, калі Заходняя Украіна, Заходняя Беларусь і працоўныя эксплёатуемыя масы заціснуты ў цяжкі фашысцкага тэрору, у БССР вялізарнымі тэмпамі разьвіваецца бурна працэс сацыялістычнага будаўніцтва і будаўніцтва беларускай культуры, сацыялістычнай па зьмесьце і нацыянальнай па форме. БССР, нават у параўнаньні з іншымі рэспублікамі Савецкага Саюзу, дабіўся вялізарнейшых посьпехаў у галіне народнай асьветы. На 13-м годзе Кастрычніцкай рэвалюцыі ў нашай краіне закладзены асновы ўсеагульнага навучаньня. У той час, калі сярэднія показальнікі па СССР даюць на 1.000 жыхароў 21,2 вучня ў школах палітасьветы па БССР мы маем у гэтых школах 21,9 проц. вучняў.

У школах сацвыху па СССР сярэдняя колькасьць вучняў на 1.000 жыхароў складае 81,9, у той час, як па БССР гэтая лічба павышаецца да 119,5. Аб росьце школьнай справы ў нашай рэспубліцы лепш за усе сьведчаць наступныя даныя: калі колькасьць насельніцтва ў БССР складае 3,4 ад насельніцтва Усяго Савецкага Саюзу, дык школы сацвыху БССР ахапляюць 4,7 проц. усёй колькасьці дзяцей, якія навучаюцца ў школах СССР, тэхнікумы-ж і вышэйшыя навучальныя ўстановы БССР ахапляюць 2,8 проц. усёй колькасьці вучняў, якія навучаюцца ў тэхнікумах і ВНУ Усяго Савецкага Саюзу.

У БССР, за час яе існаваньня, адкрыта вялізарная сетка сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў, якія падрыхтоўваюць кадры новай беларускай інтэлігенцыі, новых беларускіх пралетарскіх спэцыялістых, якія будуць будаваць сацыялізм і сацыялістычную культуру ў нашай краіне. У бягучым годзе ў вышэйшых навучальных установах 62 проц. усіх студэнтаў складаюць беларусы, у пераважная большасьць дзеці рабочых і працоўных сялян. У сельска - гаспадарчых тэхнікумах гэтая лічба павялічваецца на сёньнішні дзень на 75 проц.

Рашуча і пасьлядоўна праводзячы ленінскую нацыянальную палітыку, партыя і савецкая ўлада ліквідуюць тую спадчыну ад капіталістычнага грамадзтва, якая заключалася і заключаецца «ў перажытках вялікадзяржаўнага шавінізму, што зьяўляецца адлюстраваньнем раней прывілеяванага становішча вялікарусаў», спадчыны, якая заключаецца «ў фактычнай, г. зн. гаспадарчай і культурнай няроўнасьці нацыянальнасьцяй Саюзу рэспублікі, нарэшце, у перажытках нацыяналізму ў асяродзішчы цэлага раду народаў, якія прайшлі цяжкое ярмо нацыянальнага ўціску і якія ня здолелі яшчэ вызваліцца ад пачуцьця старых нацыянальных крыўд» (з рэзалюцыі XII зьезду УсеКП(б).

Дзякуючы правільнай ленінскай лініі нашай партыі, БССР, як і ўсе нацыянальнасьці, раней прыгнечаныя царызмам, мае магчымасьць разьвівацца вялізарнымі, нячуванымі тэмпамі.

Савецкі Саюз, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, вядзе цьвёрдую лінію на зьнішчэньне эканамічнай і культурнай няроўнасьці працоўных тых нацый, якія раней прыгняталіся. Калі возьмем пытаньні народнай асьветы, то пераканаемся, што ў той час, калі РСФСР затрачвае на народную асьвету на аднаго жыхара 1 руб. 90 кап., у тойжа час УССР затрачвае 2 руб. 80 кап. БССР—3 руб. 20 кап., а Туркмэнская ССР нават 7 руб. Тое-ж самае гаворыць нам лічбы, якія характарызуюць гушчыню школьнай сеткі ў СССР. Калі ў РСФСР мы маем на 100.000 жыхароў 104 школы, дык на Украіне маецца на 100.000 жыхароў 116 школ, а на Беларусі — 127, а ў Закаўказьзі—нават 137.

Ня толькі ў галіне нацыянальнага і культурнага будаўніцтва БССР ідзе шпаркім крокам наперад.

Такія-ж грандыёзныя дасягненьні мае рабочая кляса БССР і ў галіне гаспадарчага будаўніцтва. Рад лічб пацьвердзяць правільнасьць гэтага цьверджаньня.

Так, асноўныя фонды дзяржаўнай прамысловасьці БССР расьлі ў процантных адносінах да асноўных фондаў усяго СССР наступным чынам: у 1928 г. яны складалі 0,98, у 1930 г. ужо—1,24. Рост прамысловай прадукцыі на 13-м годзе рэвалюцыі выявіўся ў лічбе 68 процантаў, супроць прадугледжаных пяцігадовым планам 32 проц. Мы ўклалі ў капітальнае будаўніцтва 44 мільёна р., замест прадугледжаных пяцігодкай—38,4 млн. У той час, калі Савецкі Саюз за 1924-25 і 1928-29 гады меў прырост прадукцыі на 26 проц., БССР павялічыла сваю прадукцыю на 34 проц., і, нарэшце, калі ў 1929-30 годзе ўвесь Савецкі Саюз павялічыў сваю прадукцыю на 32 проц., БССР павялічыла прадукцыю ўсёй сваёй прамысловасьці на 76,5 проц.

Зразумела, гэты вялізарны рост народнай гаспадаркі БССР, і ў першую чаргу прамысловасьці, ня мог не знайсьці адлюстраваньня ў росьце ўдзельнай вагі рабочай клясы і ў росьце рабочай клясы ў абсалютных лічбах. За час з 1925 году па 1930 год колькасьць рабочых у Беларусі павялічылася больш, чым у два з пал. разы. У 1925 г. рабочая армія налічвала 21,5 тыс. рабочых, у 1930 годзе яна павялічылася на 1-е кастрычніка да 52,6 проц., прычым тэмп росту рабочай клясы БССР параўнальна з іншымі пралетарскімі цэнтрамі СССР зьяўляецца значна большым. Гадавы прырост рабочай клясы ў Масквы, Ленінградзе — ве роўны 10,7 проц., у Ленінградзе — 9,4 проц., на Урале—15,2 проц., на УССР —8,3 проц., у БССР гэты тэмп павялічваецца да 20,8 проц. Зразумела, што ў сувязі з гэтым колькасным ростам рабочай клясы расьце і ўзмацняецца вядучая роля рабочай клясы БССР у адносінах да сялянства.

Гэта найбольш яскрава мы можам праверыць на разьвіцьці калгаснага будаўніцтва.

Калі на 1 кастрычніка 1928 году мы мелі 1,1 проц. калектыўных гаспадарак у адносінах да ўсіх сялянскіх гаспадарак, то на 1 красавіка 1929 году было ўжо 2,2 проц., а на 1-е красавіка 1931 г., у сувязі з рашучым паваротам сялянскіх мас, пад кіраўніцтвам пралетарыяту і яго ленінскай партыі, на шлях сацыялістычнага разьвіцьця сялянскай гаспадаркі, колькасьць калектыўных гаспадарак параўнальна з агульным лікам гэтых гаспадарак, паднялася ў 6 раз і склала 12,6 проц.

Доля калгасаў у збожжазагатоўках за гэты час паднялася з 4,7 проц. да 25-30 проц. У цяперашні момант партыя ў сувязі з новай хвалай калгаснага прыпіву паставіла перад сабой задачу арганізаваць новыя сялянскія масы ў калгасы з тым, каб да 1-га студзеня 1931 г. ахапіць у калгасах да 20 проц. усёй колькасьці бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Адзначаючы гэтыя вялізарныя посьпехі, якія дасягнуты БССР разам і пры брацкай дапамозе ўсяго Савецкага Саюзу, неабходна адзначыць, што ў галіне якасных показальнікаў прадпрыемствы БССР, як і прадпрыемствы ўсяго Савецкага Саюзу, далёка не дасягнулі плянавых намічэньняў. Надыходзячы 14-ты год пралетарскай рэвалюцыі, які зьяўляецца і трэцім рашаючым годам пяцігодкі, акрамя далейшага фарсаваньня тэмпаў, павінен ВЫКАНЯЦЬ ЗАДАЧУ РЭЗКАГА ПАЛЯПШЭНЬНЯ Ў СПРАВЕ ВЫКАНАНЬНЯ УСІХ ЯКАСНЫХ ПАКАЗАЛЬНІКАЎ.

На базе грандыёзнага культурнага і гаспадарчага росту нашай краіны, як і ўсяго Савецкага Саюзу, расьце магутнасьць нашых рэспублік, мацнее іх абароназдольнасьць. Савецкі Саюз здолеў адстаяць пры дапамозе нашай рабочае-сялянскай Чырвонай арміі сваю небясьпеку.

Дасягненьні і посьпехі ў галіне культурна-нацыянальнага і эканамічнага будаўніцтва пралетарыят заваяваў пад кіраўніцтвам ленінскай камуністычнай партыі, перамагаючы жорсткае супраціўленьне клясавага ворага. Гэта барацьба на ўмовах БССР была накіравана, у першую чаргу, супроць вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць беларускага нацыянал-дэмакратызму і шэвінізму іншых нацый, бо пад заслонай шавінізму буржуазныя элементы ў нашай краіне прабавалі арганізаваць зрыў сацыялістычнага будаўніцтва.

Барацьба пралетарыяту за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, якая зьяўляецца крыніцай усіх нашых дасягненьняў і посьпехаў, вялася адначасова і супроць агентаў буржуазіі і кулацтва ў радах нашай партыі, супроць правых і «левых» апартуністых, а таксама супроць нацыянал-апартуністых і прымірэнцаў да усіх ухілаў ад ленінізму. Гэта непрымірымая барацьба на два фронты замацавала сталёвае адзінства нашай партыі і зьяўляецца запогам таго, што пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК мы ў XIV годзе нашай эры цьвёрда пойдзем да новых баёў, да далейшых перамог!

Шчыльней рады вакол партыі Леніна--арганізатара Кастрычніцкай Рэвалюцыі

Да ўсіх работных, работніц, калгасьнікаў, бядняцка-серадняцкага сялянства, чырвонаармейцаў і ўсіх працоўных БССР

25 кастрычніка (7 лістапада) 1917 году пралетарыят Расіі на чале з партыяй бальшавікоў, пры непасрэдным удзеле і кіраўніцтве У. І. Леніна, у крывавых баёх з царызмам, памешчыкамі і буржуазіяй устанавіў сваю дыктатуру, стварыўшы першую ў сьвеце рэспубліку рабочае клясы.

Гэрайчымі намаганьнямі ўсёй пралетарскай дзяржавы, змаганьнем за рэвалюцыю лепшых сыноў рабочае клясы і бядняцкага сялянства, пераможным змаганьнем Чырвонай арміі, рэспубліка Саветаў, даўшы руйнуючы адпор контррэвалюцыі, адстаяла магчымасьць мірнага будаўніцтва.

Трынадцацігадовая работа ва ўмовах жорсткіх клясавых баёў, пад кіраўніцтвам кампартыі, была накіравана на правядзеньне пасьлядоўнага будаўніцтва сацыялізму і прыяла да магутнага вытворчага ўздыму СССР. Краіна Саветаў сваімі ўласнымі сродкамі і сіламі, апіраючыся на творчы энтузіязм працоўных мас, дасягнула нябывалых тэмпаў разьвіцьця прамысловасьці і сельскай гаспадаркі. Перавыкананьне пляновых заданьняў пяцігодкі, якое забясьпечвае пасьпяховае выкананьне «Пяцігодкі—за чатыры гады», калектывізацыя сельскай гаспадаркі, пераход да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі, рашучае наступленьне па ўсім фронце—замаскоўнае пазыцыі сацыялізму і ператварае яго ў канкрэтнае жыцьцё і ўкараненне ў быт працоўных.

Таварышы! Посьпехі і бурны рост СССР—базы сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі—выклікаюць зьвярыную нянавісьць імпэрыялістычных драпежнікаў да рабочай дзяржавы. Буржуазія разам з сацыял-фашыстамі ні на хвіліну ня спыняе цкаваньня СССР і вядзе разьюшаную расправу з рэвалюцыйнымі рабочымі. Сусьветны капіталізм знаходзіцца ў ціскох эканамічнага крызісу, які вядзе капіталістычны сьвет да пагібелі, набліжае пралетарскую рэвалюцыю, уцягвае ўсё новыя і новыя мільёны працоўных капіталістычных дзяржаў, калёній і поўкалёній у рады змагару за сусьветны Кастрычнік. Крызіс завастрае супярэчнасьці паміж імпэрыялістычнымі дзяржавамі і набліжае новую імпэрыялістычную вайну, паскарае падрыхтоўку контр-рэвалюцыйнага ўзброенага нападу на СССР. Шалёная антысавецкая кампанія супроць Савецкага Саюзу і яго замежнага гандлю зьяўляецца далейшым крокам на шляху інтэрвэнцыі супроць СССР—бацькаўшчыны пралетарыяту ўсяго сьвету.

Таварышы! Толькі дзякуючы Кастрычніцкай рэвалюцыі, Савецкая Беларусь, у саюзе і пры дапамозе працоўных СССР, увайшла ў брацкую сам'ю рэспублік Саветаў і зьнішчае спадчыну прыгнечанай някультурнай краіны. На прыкладзе грандыёзнага сацыялістычнага будаўніцтва Савецкай Беларусі, дзе нанава будуюцца гігантыя заводы, узьнікаюць магутныя электрастанцыі, ствараюцца буйныя калектыўныя гаспадаркі, працоўныя БССР пераконваюцца ў адзіна-правільнай нацыянальнай і гаспадарчай палітыцы, якая праводзіцца КП(б)Б. Паасобныя спробы ўнутраной контр-рэвалюцыі — шкоднікаў і беларускіх нацдэмакратаў, якія зьяўляюцца простымі дапаможнікамі фашыстых, затрымаць магутны рост сацыялізму, разьбіваюцца і будуць разьбіты цьвёрдай пралетарскай рукой.

Таварышы! У дні гадавіны Кастрычніка працоўныя СССР падводзяць вынікі сваім перамогам на сацыялістычным фронце, за якімі з захапленьнем сочыць рэвалюцыйны пралетарыят Захаду і дрыжаць ад шалёнай нянавісьці капіталістыя ўсяго сьвету. Матар'яльнае становішча рабочае клясы і працоўных СССР значна палепшылася, беспрацоўе ўжо зьнішчана ў той час, як у краінах капіталізму бязупынна расьце беспрацоўе. Сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі ідзе шпаркім кронам наперад. Савецкі Саюз увайшоў у паласу практычнага ажыцьцяўленьня сацыялізму.

Гэтыя дасягненьні краіна Саветаў змагла атрымаць толькі дзякуючы правільнай палітыцы камуністычнай партыі, якая вяла і вядзе бязьлітасную барацьбу з усімі ўхіламі ад генэральнай лініі партыі, мабілізуючы масы супроць правага ўхілу, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай, супроць «левых» загібаў, супроць двурушніцтва і прымірэнцтва да ўхілаў.

Далейшае пасьпяховае разгортваньне будаўніцтва сацыялізму можа праходзіць толькі пры ўзмацненьні бязьлітаснага змаганьня з усякімі ўхіламі ад генэральнай лініі партыі, якія зьяўляюцца рупарам контр-рэвалюцыйных элементаў.

Далейшае прасоўваньне наперад па шляху пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва патрабуе яшчэ большых тэмпаў, большай напружанасьці, большай актыўнасьці працоўных мас. Перад партыяй, перад рабочай клясай, перад усімі працоўнымі напярэдадні чатырнаццатага году дыктатуры пралетарыяту стаяць задачы:

Яшчэ з большым энтузіязмам біцца за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, за ліквідацыю прарываў у прамысловасьці. Забясьпечыць ударнае выкананьне асобнага кварталу і 3-га году пяцігодкі. Арганізаваць «брыгады Кастрычніка» на штурм прарываў і ўзяцьця сацыялістычных вышынь разьвіцьця прамысловасьці. Мабілізаваць унутраныя рэсурсы прадпрыемстваў і скарыстаць цалкам і поўнасьцю рабочую ініцыятыву вынаходніцтва. Разгарнуць рабочую грамадзкасьць і ўцягнуць у творчую працу сотні тысяч новых рабочых. Выкрываць шкоднікаў і іншэ-ударнікаў, гультаёў, бюракратаў і ўсіх іншых, хто зрывае і перашкаджае нашай пераможнай працы. Не здаваць завяваных пазыцый, а яшчэ шперчэй, мэтадамі сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва змагацца за бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнай будоўлі.

На падставе правільнай ленінскай лініі мэтадамі поўнай добраахвотнасьці забясьпечыць далейшае шырокае разгортваньне калгаснага руху.

Калгасьнікі павінны дапамагчы бядняцка-серадняцкаму адзінаасобніку калектывізавацца, арганізуючы прыём новых бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у існуючыя калгасы і даючы дапамогу ў стварэньні ініцыятыўных калгасных груп. Весьці неаслабную працу па ўнутраным гаспадарчым узмацненьні існуючых калгасаў. Выканаць і перавыканаць загатоўкі па ўсіх відах, мабілізаваць сродкі на пасьпяховае выкананьне нашых плянаў. Весьці рашучае змаганьне з кулацтвам, ліквідуючы яго, як клясу, на падставе суцэльнай калектывізацыі. Ажыцьцяўляючы партыйнае і пралетарскае кіраўніцтва, разгарнуць ініцыятыву бядняцка-серадняцкіх мас вёскі за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, за новую калектывізацыю вёскі.

Задача захаваньня міру патрабуе ад працоўных СССР неаслабной увагі да абароназдольнасьці пралетарскай дзяржавы, узмацненьня цеснай брацкай сувязі з пралетарыятам і працоўнымі капіталістычных краін. Сусьветны імпэрыялізм рыхтуецца ўзброенай сілай перашкодзіць нашаму будаўніцтву. Мы павінны быць на варце. Прымежнасьць БССР яшчэ больш патрабуе ад працоўных узмацніць абарону рэспублікі Саветаў. Будзем трымаць цесную сувязь з нашай слаўнай Чырвонай арміяй і падрыхтоўваць мільённую працоўных умелых байцоў за заваяваньні Кастрычніка.

Пасьпяховае нацыянальна - культурнае будаўніцтва БССР ня можа ісьці без пасьлядоўнага правядзеньня ленінскай нац. палітыкі і рашучага змаганьня з вялікарасійскім шавінізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, адначасова ўзмацняючы барацьбу з контр-рэвалюцыйнымі нацдэмакратамі і іншымі шавінізмамі.

Узмацніць пралетарскае кіраўніцтва будаўніцтвам культуры, нацыянальнай па форме, сацыялістычнай па зьмесьце —першачарговая задача рабочае клясы і ўсёй КП(б)Б.

Працоўныя БССР! У 13 гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі яшчэ шчыльней згуртуйцеся вакол ленінскай камуністычнай партыі—кіраўніка і арганізатара Кастрычніцкіх перамог.

Няхай жыве пралетарская рэвалюцыя!

Няхай жыве сусьветны Кастрычнік!

Няхай жыве партыя Леніна!

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (бальшавікоў) БЕЛАРУСІ.

Плян сацыялістычнага наступленьня

З якім балянсам мы ўступаем у новы гаспадарчы год?

Другі год пяцігодкі характарызуецца наступленьнем сацыялізму на капіталістычныя элементы на ўсім фронце на аснове цьвёрдага правядзеньня генэральнай лініі нашай партыі, бязьлітаснай барацьбы на два фронты — супроць правых ухілаў, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, і «левых»-трацкісцкага ўхілу, а таксама прымірэнцтва да іх. Вось асноўныя показальнікі, якія характарызуюць нашы дасягненьні ў другім годзе пяцігодкі.

Вынікі другога году пяцігодкі

Калі параўнаць вынікі 1929-30 году з намічэньнямі пяцігадовага пляну, які, да рэчы, разумінікі з правага і «левага» лягеру лічылі нерэальным, дык мы бачым, што за першыя два гады пяцігодкі маем рост на валавой прадукцыі ў 150 проц. замест вызначаных пяцігадовым планам за гэтыя два гады — 87%.

Далей, калі ў пачатку 1929-30 году, плошча занятая пад калгасы вызначалася ўсяго ў 4 проц., дык да канца гаспадарчага году плошча вызначаецца ужо ў 16 проц., а калі дадаць да гэтай лічбы плошчу, занятую пад саўгасамі, дык агульная плошча сацыялістычнага сэктару вызначыцца ў 18 проц. супроць 20 проц., якія памяркаліся пяцігодкай на канец 1932-33 году.

Гіганцка вырасла сыравая база нашай прамысловасьці.

Ня меншыя дасягненьні мы маем у галіне культурна-бытавога будаўніцтва.

Такім чынам, жыцьцё жорстка перакуліла ўсе прадраканьні правых апартуністых, гэтай агентуры кулацтва ўнутры партыі, і пацьвердзіла абсалютную правільнасьць генэральнай лініі Цэнтральнага Камітэту ленінскай партыі.

Было-б няправільна, гаворачы аб нашых дасягненьнях, не паказаць на цэлы рад труднасьцяй, якія паўсталі ў працэсе бурнага росту нашай народнай гаспадаркі на шляху сацыялістычнай рэканструкцыі.

Мы маем за мінулы год цэлы рад значных прарываў, асабліва ў частцы якасных показальнікаў. Замест павялічэньня прадукцыйнасьці працы на 35 проц., мы маем павялічэньне толькі на 24 проц.; на зьніжэньні сабекошту — толькі на 8 проц. замест вызначанага планам на 1929-30 год зьніжэньня на 11 проц.

Асобны квартал і плян трэцяга году пяцігодкі

Асобны квартал павінен поўнасьцю ліквідаваць тыя прарывы, якія мелі месца ў мінулым годзе, і стварыць найбольш спрыяльныя ўмовы для далейшага фарсаванага сацыялістычнага разьвіцьця нашай гаспадаркі. Але трэба з усёй бальшавіцкай рашучасьцю адзначыць, што, на жаль, 10-дневкі кастрычніка сьведчаць аб тым, што ў адносінах выкананьня заданьняў на асобны квартал, справа ў нас, у БССР, стаіць яшчэ далёка нездавальняюча.

Па валавой прадукцыі вызначаны рост на 101,5 проц. Колькасьць рабочых узрасьце на 52,8 проц. Па прадукцыйнасьці працы вызначаны рост на 30,4 проц., на зарплаце на 5,2 проц. і зьніжэньні сабекошту на 10 проц. Па лініі капітальнага будаўніцтва ў прамысловасьці на наступны год вызначаецца ліквідаваць 108,3 млн. руб. (у цэнах 1930 году), замест фактычна вызначаных у гэтым годзе 39,6 млн. руб.

Па лініі сельскай гаспадаркі плян 1931 году павінен будзе вырашыць задачу далейшай сацыялістычнай рэканструкцыі сельска-гаспадарчай вытворчасьці, асабліва па лініі жывёлагадоўлі. Асноўныя показальнікі пляну сельскай гаспадаркі вызначаюцца ў наступным выглядзе:

Пасеўная плошча павінна ўзрасьці на 12,3 проц., у тым ліку на ільну на 53,9 проц. супроць пляну бягучага году, на бульбе — 26 проц., па травах — 105,9 проц. Капітальныя ўкладаньні па сельскай гаспадарцы вызначаны ў разьмеры 27,1 млн. руб., з іх на жывёлагадоўлі, прыкладна, 70 млн. руб., па машынабудаўніцтве — 31 млн., па мэліярацыі — 28 млн. руб. У адносінах якасных показальнікаў вызначаецца павышэньне ўраджайнасьці па саўгасах на 12 проц., па калгасах — на 10 проц., на індывідуальных гаспадарках — на 8 проц., па ільну — на 15 проц. і па бульбе—на 10 проц. — усе супроць узроўню гэтага году.

Разгортваньне мерапрыемстваў у галіне сацыяльна-культурнага будаўніцтва вызначана ў пляне ў адпаведнасьці з агульным уздымам народнай гаспадаркі. Калі ўзяць такі показальнік, як агульныя выдаткі на народнай асьвеце, дык ён паказвае, што выдаткі ў 1931 годзе на асьвеце будуць складаць 183 млн. руб., супроць 70 млн. руб. у мінулым годзе.

Асноўныя праблемы народна-гаспадарчага пляну 1931 г.

З якімі асноўнымі праблемамі мы сустрэнемся пры выкананьні будучага народна-гаспадарчага пляну?

1931 год — трэці год пяцігодкі, — павінен быць годам рэзкага пералому ў бок **ПАЛЯПШЭНЬНЯ ЯКАСНЫХ ПАКАЗАЛЬНІКАЎ.** Як у галіне прамысловасьці (па прадукцыйнасьці працы, зьніжэньні сабекошту, паляпшэньні якасьці прадукцыі), так і ў галіне сельскай гаспадаркі (павышэньне ўраджайнасьці, паляпшэньне якасьці стада і г. д.).

Ня менш сур'ёзнай праблемай у будучым годзе будзе **праблема працы.** Трэба памятаць, што пры выкананьні вызначанага пляну нам патрэбна павялічэньне колькасьці пастаянных рабочых (сярэдня гадавых) на 72,4 тыс., сэзонных рабочых на 26,8 тыс. і служачых на 14.400, галоўным чынам, па лініі асьветы і аховы здароўя. Усяго павінна быць прыцягнута 113,6 тыс. сярэдня-гадавых рабочых. У разгары сэзону нам адных сэзонынікаў будзе патрэбна звыш 100 тыс. чал.

Гэта з асаблівай вострасьцю ставіць пытаньне аб паляпшэньні арганізацыі рынку працы.

Неабходна ў далейшым весьці больш рашучую барацьбу з цякучасьцю рабочай сілы, упраўдаваць аплату за сэзонныя работы, у максымальнай ступені ўзмацніць мэханізацыю, дзе гэта магчыма.

Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на ўрэгуляваньне сацыяльнага і нацыянальнага складу новых рабочых, якія ўліваюцца ў нашу народную гаспадарку. У сувязі з гэтым прыходзіцца канстатаваць, што органы працы, у тым відзе, у якім яны зараз знаходзяцца непрыстасаваны да правядзеньня сучасных грандыёзных задач пашага сацыялістычнага будаўніцтва. Трэба рашуча перабудаваць органы працы з тым, каб яны здолелі справіцца з гэтымі задачамі.

У галіне сельскай гаспадаркі трэці год пяцігодкі па БССР павінен быць годам рэзкага павароту ў бок максымальнага фарсаванага пасеваў тэхнічных культур і разьвіцьця жывёлагадоўлі.

Жывёлагадоўля да гэтага часу зьяўляецца вузкім месцам у разьвіцьці сельскай гаспадаркі. Дасягненьні апошняга году ня выклікаюць сумненьня, але яны далёка адстаюць ад вызначаных плянаў. Адсюль на гэты бок прыдзецца зьвярнуць асаблівую ўвагу.

Па буйной рагатай жывёле вызначаецца рост на 26,6 проц., па сьвіньнях — на 50 проц. І тут з усёй сур'ёзнасьцю павінна быць пастаўлена пытаньне аб максымальным разгортваньні будаўніцтва сьвінарнікаў і кароўнікаў. Неабходна скарыстаць зімовы перыяд для таго, каб своечасова падатуліць адведную колькасьць матар'ялу, у прыватнасьці лесу, ні ў якай ступені не спыняючы будаўніцтва ў зімовы перыяд.

***

Плян 1931 году ёсьць плян далейшага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце. Ён грунтуецца на вялізарных магчымасьцях далейшага ўзросту актыўнасьці рабочай клясы, далейшага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, адкідаючы з свайго шляху ўсе ўстаноўкі правых і «левых» апартуністых.

Няма ніякіх сумненьняў, што рабочая кляса БССР, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, забясьпечыць выкананьне трэцяга рашаючага году пяцігадовага пляну.

С. ГОЛЬДБЭРГ.

За адзінства партыі на аснове ленінізму, за бальшавіцкае наступленьне па ўсім фронце

Вон з нашых радоў двурушнікаў---правых і „левых" апартуністых---здраднікаў справы Кастрычніка

Працоўныя Польшчы і Зах. Беларусі у змаганьні за Кастрычнік

Характарызуючы сусьветную сітуацыю, тав. Сталін на XVI зьезьдзе УсесКП(б) паказаў, што мінулы перыяд быў перыядам **перапомным** як для капіталістычных краін, так і для СССР. Але наміж гэтымі двума пераломамі, гаварыў тав. Сталін, існуе кардынальная розьніца. У той час, як пералом зьяўляўся для СССР паваротам у бок новага, больш сур'ёзнага эканамічнага **ўздыму**, для капіталістычных краін пералом зьяўляўся паваротам да эканамічнага **заняпаду**».

12 год кастрычніка быў годам далейшага і расту чага ўздыму СССР і далейшага абвастрэньня і павялічэньня крызісу капіталізму.

Фашыстская Польшча зьяўляецца найбольш слабым зьвяном ва ўсёй сусьветнай капіталістычнай сыстэме. Мінулы год быў годам далейшага абвастрэньня гаспадарчага крызісу ў сучаснай Польшчы. Ні стараліся і не стараюцца фашысты і іх верныя намоднікі сапраўдна-фашыстка сьрыць глыбіню крызісу, неўмалімыя факты сапраўднасьці гавораць аб тым, што крызіс расьце, што ўся сыстэма фашыстскага панаваньня трашчыць на ўсіх швах. Гаспадарчы крызіс перарастае ў крызіс агульна-палітычны.

На фоне крызісу, які пашыбляецца, на умовах галечы, беспрацоўя і голаду шырокіх працоўных мас — нястрымна расьце новы ўздым рэвалюцыйнай барацьбы. З кожным разам ўсё больш ролі адыгрывае суб'ектыўны фактар — барацьба пралетарыяту і селяньскіх мас за рэвалюцыйнае вырашэньне крызісу.

Заходняя Беларусь, якая зьяўляецца калёніяй польскага імпэрыялізму, за мінулы год яшчэ ў больш вострых формах пішла на шляху гаспадарчага крызісу. Акупацыйная палітыка польскага імпэрыялізму на Заходняй Беларусі прывяла шырокія працоўныя масы да нечуванай нужды. Голад, зьбядненьне шырокіх мас працоўнага селяньства, выміраньне мястэчка, дзесяткі тысяч беспрацоўных пралетараў — вось вымоўныя спадарожнікі жыцьця мільёнаў працоўных Заходняй Беларусі. У той час, як мінулы год быў для БССР, як і усяго Савецкага Саюзу, **годам вялікіх перамог у галіне сацыялістычнага будаўніцтва, для Зах. Беларусі**, як і ўсёй фашыстскай Польшчы, **гэты год быў годам далейшага заняпаду, далейшага абвастрэньня крызісу.** У той час, як БССР ідзе магутным ўздымам творчай ініцыятывы і энтузіязму мільёнаў працоўных, крок за крокам ідзе на шляху сацыялізму, у гэты час мільёны працоўных Зах. Беларусі, як і ўсёй Польшчы, адчуваюць на сабе жорсткі гнёт фашыстскай дыктатуры. Сьвяткуючы 13 гадавіну, падагульваючы вынікі пройдзенага этапу змаганьня, мы з ўсёй сілай павінны падрэсьліць гэту вялікую розьніцу, якая падзяляе дзьве часткі Беларусі. Савецкая частка — **БССР — гэта ўсабленьне новай, сацыялістычнай сыстэмы гаспадаркі і ўсяго жыцьця працоўных...** Заходняя частка Беларусі, якая сягоньня пад ботам фашыстскіх акупантаў, знаходзіцца ў другім сьвеце — сьвеце капіталістычным, які год за годам скочваецца на шляху заняпаду.

Т. Сталін на XVI зьезьдзе паказваў, што буржуазія будзе шукаць выхаду з крызісу ў новай імпэрыялістычнай вайне і перш за ўсё ў вайне супроць краіны сьветаў. «Кожны раз, гаварыў тав. Сталін, калі капіталістычныя супярэчнасьці пачынаюць абвастрацца, буржуазія аварочвае свае вочы ў бок СССР: ці нельга вырашыць гую або іншую супярэчнасьць капіталізму, ці ўсе супярэчнасьці разам узятыя за кошт СССР, гэтай краіны Саветаў, цытадэлі рэвалюцыі, якая адным сваім існаваньнем рэвалюцыянізуе рабочую клясу і калёніі, якая перашкаджае наладзіць новую вайну, перашкаджае падзяліць сьвет па-новаму, перашкаджае гаспадарыць на сваім вялікім унутраным рынку, так неабходным капіталістам, асабліва цяпер, у сувязі з эканамічным крызісам».

Польскі фашызм з выключнай актыўнасьцю рыхтуецца да вайны супроць Савецкага Саюзу, як да выхаду з глыбокага ўнутранага крызісу. Польскі імпэрыялізм з вялікай актыўнасьцю імкнецца да імпэрыялістычнай экспансіі на Ўсходзе. Польскі фашызм перад абліччам новай магутнай хвалі рэвалюцыйнага ўздыму рыхтуецца да вясьнных авантур супроць СССР, дзеля таго, каб у патоках крыві ўтапіць рэвалюцыйны рух і зьяўчыць крэпасьць сусьветнай рэвалюцыі. Апошні год быў годам актыўных выступленьняў з боку польскіх імпэрыялістых супроць СССР. Апошні год быў годам, калі польскі імпэрыялізм, не пакладаючы рук, **узбройваўся і узбройваецца для таго, каб кожную хвіліну быць гатовым для ваеннага нападу на Савецкі Саюз.** Заходняя Беларусь і Зах. Украіна зьяўляюцца плянцдармам вайны супроць БССР і УССР. Зразумела чаму польскі фашызм зьвяртае такую вялікую ўвагу на Зах. Беларусь і Зах. Украіну. Гэта «ўвага» выказваецца ў тым, што на тэрыторыі ЗБ фашыстскі ўрад праводзіць цэлы рад ваенных пабудоў, непасрэдна зьвязаных са стратэгічнымі плянамі польскага генштабу. Гэта «ўвага» выяўляецца ў шалёным белым тэроры, які з асаблівай сілай пануе на Зах. Беларусі і Зах. Украіне. Гэта «ўвага» выяўляецца ў тым, што польскі фашызм дапамагае заходня-беларускай буржуазіі і кулацтву, з тым, каб разам з імі, пры актыўнай дапамозе іх, распрацоўваць з рэвалюцыйным рухам працоўных мас і рыхтаваць паход на Савецкую Беларусь.

Падрыхтоўка да вайны з боку польскага імпэрыялізму праходзіць пры актыўнай і непасрэднай дапамозе з боку сацыял-фашыстскіх правадыроў. Правадыры ППС, Бунду, Сялянскай партыі і іншых пад прыкрыцьцём «левай» балбатні і гульні ў апазыцыю, актыўна змагаюцца супроць СССР, вядуць нясупынную кампанію антысавецкай хлусьні, рыхтуюць непасрэдны ваенны напад на краіну рэвалюцыі. Беларуская нацыянал-фашыстская контр-рэвалюцыя таксама з выключнай энэргіяй і актыўнасьцю пад камандай польскага фашызму і разам з ім рыхтуе антысавецкую вайну. Цяма такога бруду, які-б ня выліваўся на БССР з боку гэтых прадстаўнікоў «адзінай нацыі», «самабытнай культуры» і гэтых абаронцаў контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў з БССР. Яны ставяць стаўку на інтэрвэнцыю, яны актыўна рыхтуюць гэту інтэрвэнцыю. Прадвыбарную кампанію у сойм ўсе партыі фашыстскага лягеру, у тым ліку і беларускія нацыянал-фашыстыя скарыстоўваюць для таго, каб апляваць сацыялістычнае будаўніцтва, каб скрыць нашы дасягненьні і перамогі ад вачэй працоўных Заходняй Беларусі і ўсёй Польшчы. Новую гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі яны выкарыстаюць для таго, каб яшчэ больш узмоцніць антысавецкую хлусьню, бо кожны наш крок наперад — гэта ня толькі нашэ перамога тут у Савецкім Саюзе, але гэта і перамога сьветнай рэвалюцыі, гэта ўдар на ўсім капіталізьме. Але чым актыўней фашызм і сацыял і нацыянал-фашызм рыхтуецца да вайны супроць Савецкага Саюзу, тым актыўней барацьба шырокіх працоўных мас у абарону Савецкага Саюзу.

Мы бачым, як ў Польшчы, а таксама і на Зах. Беларусі абвастрэцца клясавая барацьба. Кляса супроць клясы стаіць **у сьмяротнай барацьбе.** Над сьцягамі камуністычнай партыі аб'ядноўваецца ўсё большыя і большыя масы рабочае клясы і працоўнага селяньства. Прадвыбарная кампанія яшчэ раз пацьвярджае той факт, што рэвалюцыйны ўздым расьце і пашыбляецца. **Ня гледзячы на бязьлітасны масавы тэрор, ня гледзячы на карныя экспэдыцыі, расстрэлы і турмы — працоўныя Польшчы і Зах. Беларусі пераходзяць у контр-наступленьне і наступленьне супроць фашыцкай дыктатуры.** Кожны дзень прыносіць нам факты, якія гавораць аб тым, што ў гарадох, і вёсках растуць рэвалюцыйныя ўплывы кампартыі, што ўсё больш вострымі зьяўляюцца выступленьні рабочых і працоўных сялян супроць фашыцкага прыгнечаньня.

Мы ўжо гаварылі, што працоўныя масы Зах. Беларусі і Польшчы актыўна абараняюць Савецкі Саюз. У той барацьбе, якая разгортваецца там, за нашымі заходнімі граніцамі, пытаньне стаіць так: той хто за Савецкі Саюз — той за рэвалюцыйнае зьвяржэньне фашыстскага ўціску, той за новае жыцьцё, той супроць сваіх уласных капіталістых і абшарнікаў; хто выступае супроць Савецкага Саюзу — той клясавы ворат працоўных, той за замаханьне фашыстскага панаваньня.

І таму пад сьцягамі рэвалюцыйнай абароны Савецкага Саюзу аб'ядноўваецца ўсё большыя масы працоўных, якія ня хочуць жыць па-старому і якія ў Савецкім Саюзе бачаць той шлях, ідучы па якім яны прыдуць да пралетарскай рэвалюцыі. Кампартыя Зах. Беларусі ў сваёй адозьве да працоўных Зах. Беларусі, прысьвечанай 13-ай гадавіне, піша: «Кастрычніцкая рэвалюцыя вучыць працоўныя масы Польшчы і Зах. Беларусі аб тым, якім шляхам трэба ісьці, каб устанавіць сваю **рабоча-сялянскую ўладу.** Шлях гэты — пралетарская рэвалюцыя, зьвяржэньне ўлады буржуазіі, шляхам масавага ўзброенага паўстаньня». Кампартыя Зах. Беларусі выразна заяўляе, што: «абарона краю савецкаў ад узброенага нападу міжнародных і польскіх імпэрыялістых — гэта клясавы абавязак кожнага рабочага, кожнага працоўнага Польшчы і Зах. Беларусі. На фабрыках і заводах, на мабілізацыях, вёсках і мястэчках, усюды павінны расьці і разгортвацца рэвалюцыйная барацьба мас супроць фашыцкай дыктатуры, супроць яе імпэрыялістычных плянаў, у абарону СССР».

І мы бачым, як на рэвалюцыйным заклику нашай гэрайчнай кампартыі Зах. Беларусі — усё актыўней выступаюць рабочыя і працоўныя сяляне на абарону СССР. Ніякая хлуская фашыстых і нацыянал-фашыстых ня можа пераспаніць гэтую рэвалюцыйную барацьбу мас у абарону сваёй сацыялістычнай бацькаўшчыны. Працоўныя масы горача вітаюць бальшавіцкую палітыку, якую ажыцьцяўляе кампартыя СССР і яе атрад — КП(б)Б. Працоўныя масы Зах. Беларусі в абурэньнем выступаюць супроць контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў, якія разам з нацыянал-фашыстымі, імкнуцца ператварыць БССР пакшталт Зах. Беларусі ў калёнію польскага імпэрыялізму. У дзень 13-й гадавіны ў гарадох і вёсках Зах. Беларусі наперакор палицэйскаму тэрору — працоўныя масы будуць выступаць пад кіраўніцтвам кампартыі, пад дэвізамі абароны СССР.

На чале працоўных Зах. Беларусі, Зах. Украіны і Польшчы стаіць кампартыя Польшчы — гэтая штурмавая калёна сусьветнай рэвалюцыі. Мінулы год быў для кампартыі Польшчы і яе баявога атраду — КПЗВ годам упартай барацьбы за бальшавіцкую лінію пад адноўленым кіраўніцтвам супроць правапартуністычнай групы Варскага, Лапінскага, Кастржэвы, Бранда і інш., як галоўнай небясьпекі, і супроць «левых» загібаў і памылак. Гэта быў год вялікіх перамог у галіне бальшавізацыі партыі. **5 зьезд КПП быў зьездам бальшавіцкай непрымірымасьці і бальшавіцкага адзінства.** Гэты зьезд нанёс руйнуючы ўдар правапартуністычнай групе Варскага, Кастржэвы, Лапінскага. Ён прымусіў да капітуляцыі частку гэтай групы (Пруханік, Стэфанскі і інш.). Зьезд паставіў перад партыяй задачу далейшай непрымірымай барацьбы супроць правай групы, супроць яе правых кампаньяў і тэорый, як галоўнай небясьпекі і супроць «левых» настроіў, як рашучую ўмову для пасьпяховай мабілізацыі мас пад сьцягамі кампартыі. Зьезд распрацаваў праграму рэвалюцыйнай барацьбы на ўвесь бліжэйшы этап абвостраных клясавых баёў, якія пад кіраўніцтвам кампартыі і яе бальшавіцкага ЦК будуць разгортвацца і вырастаць у бой за ўладу.

Працоўныя масы БССР, сьвяткуючы 13-ю гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі, будуць адначасова з гэтым дэманстраваць сваю рэвалюцыйную салідарнасьць з прыгнечанымі масамі Зах. Беларусі і Польшчы. У дзень 13-й гадавіны працоўныя БССР нашлюць сваё гарачае прывітаньне тым, хто ня на жыцьцё, а на сьмерць, змагаецца супроць фашыцкай дыктатуры і яе агентаў, змагаецца у абарону СССР.

Працоўныя БССР будуць вітаць бальшавіцкі авангард рабочае клясы і працоўнага селяньства ЗБ і ўсёй Польшчы — гэрайчную кампартыю Польшчы і кампартыю Заходняй Беларусі.

А. Альшэўскі.

НА ВАРЦЕ кастрычніцкіх заваёў

XIII гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі мы сустракаем у абстаноўцы сацыялістычнага наступленьня на ўсім фронце ўнутры краіны і значнага абвастрэньня супярэчнасьцей між СССР і капіталістычным сьветам.

Ва ўсіх капіталістычных краінах абвастрэцца супярэчнасьці паміж буржуазіяй і пралетарыятам, нагарэцца жыцьцёвы ўзровень мільёнаў працоўных, праводзіцца шалёны паход на зарплату і рабочы дзень, бурна расьце беспрацоўе.

Цяжкае становішча рабочае клясы капіталістычных краін узмацняе раваюцыйны рух, узмацнае ўплыў брацкіх нам камуністычных партый на рабочую клясу.

Усё гэта выклікае вострую нянавісьць з боку капіталістых да Савецкага Саюзу, як цытадэлі сусьветнай рэвалюцыі.

Падрыхтоўка вайны вядзецца ўсімі магчымымі спосабамі і сродкамі. Ставяцца ўзброены антысавецкі блёк дзяржаў, што абружаюць СССР, робяцца ўсе спробы стварэньня эканамічнай блёкады СССР, разгортваецца шалёная антысавецкая кампанія, пад відам барацьбы з так званым «савецкім дэмпінгам», засядаюць «аграрныя канфэрэнцыі», адбываюцца нарады генэральных штабаў, расьце ваенны бюджэт Польшчы, Румыніі і Прыбалтыцкіх краін. Усё гэта — яўная падрыхтоўка міжнароднага імпэрыялізму да вайны супроць Савецкага Саюзу.

Але імпэрыялізм на толькі стварае ўзброены блёк супроць СССР. Апошнія месяцы выявілі, якую шырокую ідэалёгічную работу імпэрыялізм арганізуе ўнутры нашай краіны.

Шкодніцтва нельга разглядаць па-за агульнай кампаніяй падрыхтоўкі новай вайны супроць СССР.

Верны вартаўнік рабочае клясы АДНУ б'е стаўку шкоднікаў, пралетарыят — пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі, перамагаючы ўсе труднасьці, напыхае і ўзмацняе індустрыялізацыю і калектывізацыю краіны — аснову нашай абароназдольнасьці.

«Зьезд з усёй рашучасьцю паказвае на неабходнасьць згуртаваньня ўвагі партыі і яшчэ большай мабілізацыі ўсіх сіл рабочае клясы і бядняцка-сярэдняцкіх мас селянства на ўзмацненьне абароназдольнасьці СССР, магутнасьці і баяздольнасьці Чырвонай арміі, моснага і паветранага флёту»,—гэта дырэктыва XVI зьезду партыі павінна ўсёй рабочай клясай, нашай партыяй, усёй нашай грамадзкасьцю з вялізарнейшай актыўнасьцю праводзіцца ў жыцьцё.

Гігантскі рост індустрыялізацыі краіны дае магчымасьць тэхнічна ўзброіць нашу Чырвоную армію. У нагу з індустрыялізацыяй расьце тэхнічная магутнасьць нашай Чырвонай армії. Узмацненьне тэмпаў індустрыялізацыі азначае яшчэ большае паширэньне матар'яльнай базы абароназдольнасьці краіны, азначае яшчэ больш рост тэхнічнай магутнасьці Чырвонай арміі.

16-ты вартаўзьезд у сваіх пастановах **«падкрэсьлівае ўсё значэньне бальшавіцкіх тэмпаў сацыялістычнай індустрыялізацыі краіны для забясьпячэньня эканамічнай самастойнасьці СССР, для ўзмацненьня абароназдольнасьці пралетарскае дзяржавы і адпору усялякім спробам інтэрвэнцыі з боку міжнароднага імпэрыялізму».**

XIII гадавіна Вялікага Кастрычніка сустадае з дзесяцігодзьдзем разгрому рэштак рускай контр-рэвалюцыі — Врангеля.

Дзесяць год назад, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі—узброеная апора дыктатуры пралетарыяту — Чырвоная армія нанесла апошні, руйнуючы ўдар рэштках сіл памешчыцка-капіталістычнай контр-рэвалюцыі.

Бясьпрыкладны ў гісторыі гэрайчны штурм Перакопу пачаўся 8-га лістапада. Чырвоныя палкі, захопленыя вялізарнейшым энтузіязмам, рваліся ў бой і жадалі ва што-б ні стала пакончыць з «крымскай стрэмкай» — у дзень Вялікага Кастрычніка рушылі ў лоб на штурм бэтонных умацаваньняў, насустрач лавіне зьвінцу і сталі.

Нішто не маглі спыніць гэтых гэрояў, захопленых клясавай нянавісьцю да сваіх ворагаў. Байцы паўднёвага фронту ў дзень 3-годзьдзя Кастрычніка, рабочай клясе, сваёй партыі паднесьлі падарунак — Савецкі Крым, разгром Врангеля.

Толькі дзякуючы таму, што партыя ўсе свае сілы сканцэнтравала на Чырвонай арміі, толькі дзякуючы таму, што партыя, як і ў дні Кастрычніка, адолела сваім правільным кіраўніцтвам быць моцнай на галоўным, рашаючым кірунку, толькі дзякуючы непахіснай веры у сваю партыю з боку рабочае клясы— мы дабіліся перамогі.

Чырвоная армія, пад кіраўніцтвам сваёй партыйнай арганізацыі, была, ёсьць і будзе ўзброенай апорай дыктатуры пралетарыяту, верным вартавым савецкіх межаў, верным абаронцам мірнай працы, гігантскага будаўніцтва сацыялізму.

Партыйная арганізацыя Чырвонай арміі была, ёсьць і будзе сапраўднай апорай ленінскага ЦК у яго барацьбе з ворагамі ленінізму. У нагу з усёй партыяй партарганізацыя Чырвонай арміі панесла руйнуючы ўдар контр-рэвалюцыйнаму трацкізму, вядзе непрымірымую барацьбу з правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, дала рашучы адпор «левым» фразэрам.

Зараз, калі правыя апартуністы зноў прабуюць ажывіць сваю дзейнасьць, партарганізацыі часьцей Чырвонай арміі адпадушна выказаліся за ўзмацнёнае да ўсіх двурушнікаў, да ўсіх эрадыкаў пастановы XVI зьезду УсесКП(б) аб несумяшчальнасьці прабываньня ў партыі з пранагандай правых поглядаў.

У барацьбе за адзінства партыі, за сталёвую згуртаванасьць бальшавіцкіх радоў, за ленінскі ЦК — партарганізацыя Чырвонай арміі зьяўляецца адным з маладзейшых атрадаў УсесКП(б) і непахісна ідзе на верным ленінскім шляху.

У краіне Савецкаў набачаныя гістарычныя зрухі. Жаўтная пралетарская рука над кіраўніцтвам партыі краіна перавараецца **з краіны аграрнай у краіну прамыслова-аграрную.** І Чырвоная армія ў сваёй рабоце па ўмацаваньні абароназдольнасьці краіны не адстае ад набачаных, гігантскіх тэмпаў у будаўніцтве сацыялізму.

У гэрайчных армейскіх будзях выпоўваецца палітычна-сьвядомы баец, верны абаронца пралетарскіх межаў. У сьценах чырвонай казармы кожная свабодная мінута скарыстоўваецца на вучобу, на ковку, набываную і пачуваную ні для якай іншай арміі, работу. Пасьля гадзін упартай баявой вучобы працуюць курсы трактарыстых, шофэраў, кіно-мэханікаў, калгасьнікаў-арганізатараў, жывёлаводаў, втузаўцаў.

Армія дае на толькі адданага рэспубліцы байца. Армія дае кадры, кадры гігантскі ўзрастаючай краіне. У калёнах «верноты-стовскіх» МТС, трактарах калгасаў і камун, на першых курсах тэхнікумаў і ўнівэрсытэтаў, у цесных палкоўчыках сельскіх саветаў, на бязьмежных прасторах Далёкага Ўсходу, на асушаных балотах Палесься — усюды відна яшчэ не пасьпеўшая выцьвісьці запчытная гімнасьцёрка дэмабілізаванага байца — чырвонаармейца.

Чырвоная армія дае кадры, Чырвоная армія дае стойкае папаўненьне на гігантыя-заводы, на палі сацыялістычнай будоўлі.

Адна з галоўных традыцый Чырвонай арміі і яе важнейшая палітычная задача — гэта быць актыўным удзельнікам у правядзеньні гаспадарча-палітычных кампаній. У часе абожжазагатовак, асеньняй сяўбы, уборкі бульбы — сотні і тысячы чырвонаармейскіх брыгад непасрэдна, практычна дапамагалі калгасам і саўгасам.

Мы знаходзімся напярэдадні важнейшай кампаніі — «дэкады абароны».

Яна высоўвае рад адказьнейшых задач у галіне ўмацаваньня абароназдольнасьці краіны.

У дэкаду абароны павінна быць узмоцнена пранаганда пастановаў XVI зьезду УсесКП(б) у пытаньнях умацаваньня абароны Савецкага Саюзу.

Трэба шырока мабілізаваць увагу працоўных вакол пытаньняў тэхнічнага росту РСЧА, мэханізацыі і матарызацыі Чырвонай арміі. Трэба растлумачыць важнасьць разьвіцьця грамадзянскага авіяцыі і дырыжаблябудаўніцтва.

За ўсе 13 год існаваньня краіны Саветаў СССР праводзіў і праводзіць надхільную палітыку міру. Але мы ведаем і бачым, як са дня на дзень міжнародны імпэрыялізм рыхтуецца да ўзброенага нападу на нас. І мы павінны быць гатовымі да стойкай абароны сацыялістычнага будаўніцтва.

Няхай напрабуюць нашы ворагі падкідаць меч!

На варце межаў Савецкага Саюзу стаіць моцная і магутная Чырвоная армія, якая згуртавана з усім працоўным насельніцтвам нашай краіны.

Ворагі сустрэнуць руйнуючы адпор з боку Чырвонай арміі і працоўных мас, якія згуртаваліся над баявым сьцягам камуністычнае партыі, пад сьцягам Леніна.

М. ВІЛЬКАБРЫСКІ.

„Назад, а не наперад“— такі лёзунг сучаснай буржуазнай навукі

З шалёнай нянавісьцю ўстрэла буржуазія ўсіх краёў Кастрычніцкую рэвалюцыю. Ня было ні адной зброі ў арсэнале буржуазіі, якая ня была-б скарыстана ў змаганьні супроць сацыялістычнай рэвалюцыі. Усе сродкі, уся сіла і моц клясавага ворага былі кінуты на гэта змаганьне: даляры і фунты стэрлінгаў, танкі і аэраплёны, журналісты і прапаведнікі, навука і рэлігія,— усе яны былі мабілізаваны супроць «бальшавіцкай заразы».

Бальшавікі парушаюць сьвятое права ўласнасьці — гэта быў лейт-матыў антыбальшавіцкай прапаганды. Ачмуляных рэлігійным туманам запалохвалі тым, што бальшавікі — антыхрысты, «анакрытычны зьвер» і г. д., і г. д. Абывацелі, для якога «супружеское ложе» зьвяшчана сьвятым-сьвятым, запалохвалі тым, што бальшавікі праводзяць нацыяналізацыю жанчын, што бальшавікі разбураюць сьвяты сямейны агач. А на каго такія недарэчнасьці ня мелі ўплыву, для тых былі асобныя прыёмы антыбальшавіцкай агітацыі і прапаганды. Тут на арэну выступала «навука» у асобе ае прафэсараў. Навука супроць бальшавізму, а бальшавікі супроць навукі— так тлумачылі яны на розныя лады. Бальшавікі — гуны XX веку, душыцелі культуры, ворагі «прагрэсу і цывілізацыі».

Сацыялізм — гаварылі філёсофы буржуазіі — гэта выражэньне чалавецтва, зьніжэньне індывідуальнае творчасьці чалавечай асобы, пагібель культуры, сьмерць мастацтва, канец навукі. Культура — гаварылі філёсофы сацыялізму непатрэбна. Ім — прыхільнікам сацыялізму — патрэбен хлеб, сала і боты. Таленты сацыялізму непатрэбны. Ім патрэбна шэрая маштонная чалавечая маса. Так вучылі яшчэ задоўга да Кастрычніцкай рэвалюцыі вучоныя прыказчыкі капіталізму, кухары ад навукі, якія гатуюць тэарэтычныя стравы на густах і заказах «нанажанай кліэнтуры», жаноў капіталістых.

Гэта «вучэньне» з асаблівай сілай адмавілася ў перыяд барацьбы супроць Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Ворагі пралетарскай рэвалюцыі, ня раз зварачаліся ў сваім змаганьні да вічнага культуры. З аднаго боку, яны проціставілі культуру сацыялізму, сьцьвярджаючы, што сацыялізм, быццам, азначае пагібель культуры. А таму — той хто за культуру — няхай той змагаецца супроць бальшавізму. З другога боку, яны сьцьвярджалі, нездаволены, што сацыялізм — гэта вельмі ўзвышаная і шляхетная справа, таму гэта можа быць ажыцьцёўлена толькі «шляхетнымі і ўзвышанымі» людзьмі, а не грубымі бязкультурнымі рабочымі. Куды ім да такой тонкай ідэі!

На гэтай зьвышагіднасьці вядомы Нётр Струве будаваў свой «довад» аб немагчымасьці сацыялізму. Адно з двух — калі станоўчна рабочая клясы па меры разьвіцьця капіталізму будзе рабіцца ўсё лепшым і лепшым, тады рабочай клясе сацыялізм непатрэбен. Калі-ж станоўчна рабочая клясы будзе ўсё больш і больш пагаршацца, дык яе культурны ўзровень ажакажацца настолькі нізкім, што яна будзе нездольная **ня толькі рабіць,** але і думаць аб сацыялізьме. Сытаму сацыялізм непатрэбен, галодны ня ў стане будаваць яго — вось усяе «філёсофія» бандаласьці.

Такім чынам, гаварылі філёсофы буржуазіі, ня можа быць ніякага сацыялізму. Ды і ці будзе мы спрачацца з усімі гэтымі — з дазволу сказаць — «тэорыямі». Мы гэта лічым дарэмнай працай. Што пралетарыят СССР, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, зрабіў сацыялістычную рэвалюцыю, што ён будуе сацыялізм — гэта ў довадах ня мае патрэбы. Гэты факт ня мае патрэбы таксама ў довадах таго, што пралетарская культура ў СССР расьце з кожным днём, з кожнай гадзінай. Мы гэта бачым непасрэдна вокам. Пяцігодка сацыялістычнага і культурнага будаўніцтва аб гэтым выразна гаворыць.

У царскай Расіі лічылася цудам, і яно, бадай, такім і было, калі камунебудзь з загнаных, забітых, зьняволеных работых і сялян удавалася аўладаць вышэйшымі навукі і мастацтвам. Аб такім цудзе, аб такіх адзінкавых фактах — гаварылі амаль праз палыя сталодзьдзі. У нас, у СССР, такія «цуды» здараюцца кожны дзень, кожную гадзіну. У кожнай ВНУ, ВТНУ, рабфаку мы бачым лябараторыі гэтых «цудоўных» першых посьпехі зьдзіўляюць сваёй грандыёзнасьцю. Буржуазія, перагортваючы апошнюю старонку сваёй культуры і навукі, бачыць, што гата апошняя старонка — ёсьць старонка выраджэньня буржуазнай навукі, загніваньне яе культуры.

Які бок сацыяльнага жыцьця капіталістычнага ладу мы-б ні ўзялі, мы ўсюды натыкаемся на адно і тое-ж трывожнае слова: крызіс. У эканоміцы — крызіс, расхістаньне асноў капіталізму, у палітыцы — крызіс, адмаваньне старых спосабаў кіраваньня буржуазіі — парлямантарызму і дэмакратыі, фашызацыя буржуазнай дзяржавы і г. д. Сярэдні ўсюды адчуваецца сустрэчалі не гістэрычныя дамы і на мітынгах, дзе ўсюды ідэі, якія ня выжыўшыя з розуму старухі, а прадстаўнікі навукі, людзі з навуковым імем. Ці выпадкова гэта для буржуазнай навукі? Не, невыпадкова! Ужо да гэтага выдатнейшы вучоны **Лодж** пісаў: «Факты пераканалі мне, што ўсабістае быццё захоўваецца за межамі цялесная сьмерці. Бесцялесны розум можа іры пэўных умовах увайсьці ў сувязь з намі».

І гэту бязглуздзіцу пісаў адзін з выдатнейшых вучоных клясы буржуазіі. Навука загніваючай клясы — ёсьць гніляя навука. — вось тая ісціна, якая вынікае з гэтых фактаў.

Нараўнаце наступныя маленькія факты:

а) У Амэрыцы жыў і тварыў адзін з найвыдатнейшых біялёгаў Ж. Лёб. Біялёг, вельмі блізкі да матар'ялізму. Пісаў ён, зразумела, на ангельскай мове. Кнігі яго перакладзены на многія мовы, у тым ліку і на расійскую, у выданьнях Дзяржвыдавецтва. І вось аказваецца нікантная дробязь. Тыраж яго кніг у расійскім перакладзе, у «барбарскім» СССР **перавышае** тыраж яго кніг у арыгінале на ангельскай мове, у яго родным «высока культурным» Амэрыцы. У Амэрыцы, бачыце, не хапіла для выданьня кнігі наперы, шрыфту і сродкаў!

б) Факт другі. Кожны год выдасцца на ўсім сьвеце 500.000.000 экзэмпляраў біблі і эвангельля. Для гэтага хапае паперы, шрыфту і сродкаў!

Супастаўце гэтыя факты — і вывад напрашваецца сам сабой. У «культурных Амэрыцы і Эўропе няма месца для навукі, але ёсьць шырокія магчымасьці для рэлігіі.

«Licht, mehr licht» (**сьвятла, больш сьвятла**) - гаварыла калісьці малодая буржуазія.

«Цемры, больш цемры» — крычыць ў агоніі буржуазія зараз.

Буржуазія праводзіць «нацыянальную палітыку». Яна кожны год друкуе паўмільярда экзэмпляраў біблі на 630 мовах і дыялектах. Буржуазія прабуе задушыць працоўных усіх краін на іх роднай мове. Для біблі і эвангельля «нацыянальная палітыка» прызнаецца. Атруціць на роднай мове — ад гэтага буржуазіі не адмаўляецца.

Яшчэ да гэтага часу выдасцца разьвіцьцём навы Рымскага — Ватыкана (ды яшчэ з падвойнай сілай!) „Index librorum prohibitorum"—сьпіс забароненых кніг. Галава царквы, пры дапамозе «культурных сіл грамадзянства», накладае забарону на самае каштоўнае, што было створана чалавецтвам. Зразумела, што кнігі Леніна, Маркса, Энгельса зьяўляюцца «шкодлымі» і забараняюцца, але такі-ж лёс напаткаў і глыбокіх, сьмелых мысьліцеляў буржуазіі ў перыядзе яе выступленьня на гістарычную арэну. Забаронен Гобс, Паскаль, Мантэк'е, Русо і інш.

Манархічны саюз у Англіі выпусьціў нядаўна свой сьпіс «шкодных аўтараў», якіх «прыхаваны чалавек» не павінен чытаць. Сярод «шкодных» аўтараў мы знаходзім: М. Горкага, А. Франса, Рамэн-Ралана і... А. Эйнштэйна, творцы тэорыі адносьнасьці. Аб ім дасцца наступная характарыстыка: «Вучоны варожы ўсякай традыцыі. Ён не абмяжоўваецца матэматычнымі працамі, а палітызьвае бальшавізм» (?).

Ды навошта гаварыць аб сьпісах забароненых кніг, якія выдаюцца царкоўнікамі і «прыватнымі» арганізацыямі, калі і афіцыяльныя ўрадавыя органы прымаюць удзел у гэтай «культурнай справе». Забаронена-ж у Амэрыцы афіцыйным пагадкам выкладаньне ў школе прыцыпу дарвінізму. Ня менш характэрным зьяўляецца тое, **як,** у якой форме некаторыя вучоныя ў Амэрыцы прабуюць стаць на абарону дарвінізму. Мы не бязбожнікі—апраўдваюць яны, — мы таксама верым у рэлігію, мы толькі іншым разумеем і тлумачым самую біблію, так што яна не супярэчыць... дарвінізму.

Ці патрэбна яшчэ даводзіць тое, што ў капіталістычных краінах рэлігія перамагла навуку, ператварыла яе ў сваю служку. Узоры сярэдзьвякоўя лунаюць над сучаснай «архі-культурнай» Эўропай. **У капіталістычных краінах навука зрабілася прыдаткам да фашызму.** Яна існуе толькі ў тых межах, у якіх гэта ёй дазваляецца панай-рэлігіяй. Аналёгічна гэтаму буржуазная навука становіцца дадаткам да **фашызму.** Нідзе ве выступае ў такой яскравай і выразнай форме лёкайская роля буржуазнай навукі і культуры, як у чорнарубашачнай Італіі. Што такое італьянская акадэмія навук і інш. навуковыя ўстановы? Гэта толькі аркестры, якія пайшны на мове сваіх «інструмантаў» сьпяваць гімны фашызму і яго правадыру — Мусаліні. Чым займаецца акадэмія — гэта ня важна. Важна тое, каб кожны яе крок, кожны досьлед быў-бы так ці інакш зьвязаны з імем Мусаліні. Вучоны займаецца гісторыяй? Добра, хай ён «толькі» давядзе, што на нараджэньня Бэніта Мусаліні чалавецтва блукала ў хаосе сваёй прадгісторыі, а **гісторыя** чалавецтва, разумеецца, пачынаецца з Мусаліні.

Прэміюць кае-небудзь за адкрыцьцё? Няхай. Але пры тай умове, каб фонд прэміяваньня называўся-б фондам Мусаліні. У Італіі зараз існуе пэлы рад падобных «фондаў Мусаліні». Кожная буржуазная арганізацыя стараецца паказаць сваю адданасьць фашызму і чым-небудзь увекавечыць імя «вялікага дучэ».

Да чаго даходзіць гэты культ прадажыра фашызму Мусаліні мы можам бачыць з наступнага факту: у Італіі з вялікай помпай рыхтуюцца да сьвяткаваньня 2.000-годзьдзя са дня нараджэньня рымскага паэты старажытнасьці Віргілія. Ураўстасьці гэтыя павінны праходзіць пад знакам «нацыянальнае самасьвядомасьці». Гэта значыць, пад знакам фашызму. І вось італьянская акадэмія навук вызначыла прэмію ў 50.000 лір таму, хто напішна працу аб Віргілію, у якой ён даведзе, што Віргілій 2.000 год таму назад ужо «продвохкітыі» образ Мусаліні і ідэю фашызму...

Навука, якая павінна служыць «нацыянальнай самасьвядомасьці» цесна зьвязана з «самабытнасьцю». З гэтага пункту гледжаньня цікава адзначыць апошняе «навуковае адкрыцьцё» аднаго фашыстскага «вучонага», а іменна, што Шэкспір быў італьянцам, называўся італьянскім імем, а ангельцы ўкралі ў італьянцаў іх нацыянальную славу. Італьянскія газэты з банькаўскім клопатам абараняюць чарговае адкрыцьцё фашыцкай навукі.

Аналёгеты буржуазіі хвасьліва гавораць аб «багатай, магутнай», буржуазнай культуры. Пры гэтым яўсім упускаецца з-над увагі для чаго служыць гэта культура і каму яна служыць.

— Глядзеце, — гавораць нам гэтыя наймиты капіталу, — у цялым радзе буржуазных краін ужо даўно існуе ўсеагульнае пачатковае навучаньне. Буржуазія навучае ня толькі сва

Першая Белдрэс імя Сталіна скончана

ПУСК АСІНБУДУ—ВЯЛІЗАРНАЯ ПЕРАМОГА САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ, БУЙНЕЙШЫ ЎКЛАД У СПРАВУ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ БССР

Станцыя пабудавана наперакор дэзарганізатарскай рабоце апартуністых і ныцікаў, якія ня вераць у сілы рабочае клясы

Далоў здраднікаў сацыялістычнага наступленьня—правых і „левых“ апартуністых і іх рознавіднасьцяй у БССР—нацыянал-апартуністых

НАПЕРАД, ЗА БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ, ЗА БУДАЎНІЦТВА ВОЛАТАЎ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ!

Рабочы шчотачнай фабрыкі, ударнік вынаходца Палякоў, удасканаліў часальную машыну, што палепшыла якасьць і дасьц каля 14.000 р. эканоміі

Першая Белдрэс зьменіць эканоміку ўсяго раёну

Гэраічнымі намаганьнямі рабочай клясы БССР, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, атрымана яшчэ адна перамога на фронце сацыялістычнага будаўніцтва. На тарфяных балотах Асінаўкі скончана пабудова першай чаргі Белдрэс імя Сталіна.

Пабудовай моцнай электрастанцыі яшчэ раз даведзена ўсім ныцікам, прадым ухілістым, двурушнікам, што тольки правільная генэральная лінія камуністычнай партыі забясьпечвае перабудаваньне СССР з краіны эканамічна-адсталай, некультурнай у краіну індустрыяльную.

Камуністычная партыя, на чале са таім ЦК, увесь час вядзе правільную ленінскую нацыянальную палітыку, накіраваную на ўздым былых адсталых і прыгнечаных нацыянальных вобласьцей, БССР адна з такіх адсталых у мінулым вобласьцяй за 13 год стала зусім непазнаванай як у эканамічных, так і культурных адносінах, дзякуючы тэй дапамозе, якую аказваў увесь час урад БССР.

З кожны днём расьце сацыялістычная прамысловасьць.

Калі выпуск валавой прадукцыі па рэспубліканскай прамысловасьці складаў у 1925-26 г. 75 млн. руб., у 1926-27 годзе—88,3 млн. руб., у 1927-28 г.—115,8 млн. руб., 1928-29 г. — 171,5 млн. руб., у 1929-30 годзе — 287,5 млн. руб., дык кантрольныя лічбы на 1931 г. прадугледжваюць выпуск валавой прадукцыі (без Лесбелу) на 583,7 млн. руб.

Значна ўзрастае капітальнае будаўніцтва — адпаведна: 5,3 млн. руб.—10,8—16,4 — 24,7 — 42 млн. руб.

Таксама павялічваецца колькасьць рабочае сілы—адпаведна: 24,8 тыс. — 26,2—23,7—34,2—42,8 тыс. рабочых.

Аднак, ня гледзячы на буйное разгортваньне прамысловасьці БССР, тэмпы электрыфікацыі разьвіцьця энэргагаспадаркі значна адстаюць ад агульных тэмпаў нашага разьвіцьця. Пры актыўным падтрыманьні ўраду СССР мы здолелі пабудаваць энэргагігант — Белдрэс імя Сталіна, якая зьменіць эканоміку ўсяго раёну.

Адкрываючы першую Белдрэс трэба падкрэсьліць, што ўдарніцкі рух сярод рабочых і інжынэрна-тэхнічнага складу значна дапамог хутчэйшай пабудове станцыі. Масавыя суботнікі, напружаная работа па абсталяваньні станцыі, рад фактаў гэраічных перамог труднасьцяй на шляху пабудовы станцыі, заслугоўваюць адзнакі. Таму ўрад БССР узнагародзіў рад рабочых-ударнікаў і інжынэраў рознымі прэміямі, ордэнамі працоўнага сьцягу і інш.

У дзень пуску першай Белдрэс—шчыра прывітаньне ўсяму рабочаму калектыву станцыі.

ГРЫСЭВІЧ.

Кіраўнікі Асінбуду: намесьнік галоўнага інжынэра РУСАНАЎ
Галоўны інжынэр Алейнікаў, намесьнік галоўнага інжынэра Шаршнёў

ЮРКА ЛЯВОНЫ

СЛУХАЙ ПУЛЬС ІХ, ТАВАРЫШ СТАЛІН!

Нячуваны ніколі памер
Набывае ўрачыстасьці рэха;
Будзь ударнікам, сёнешні верш,
Гадавым паэтычнага цэха!

Будзем славіць агністым радком
Гераіны турбінных упораў,
Сваіх змагароў,
На чый кон
Ніж нянавісьці вытачыў вораг.

Іх ні лічбам спужаць,
Ні рыдлёўкам,
Іншы гонарам клясы паўсталі.
Іхтны гімны матораў далёка,
Слухай пульс іх, таварыш Сталін!

... Стагодзьдзі йшлі...
Чарнелі на балотах.
Кроль—дзікі край міязмаў і багны.
На возеры шумлівыя чароты
Былі на варце сумнай старары.
Праплывалі міма лістапады,
Асеньні ліст губляючы ў кусты,
Не расквітала сном нямая радасьць
Час надзей паволі тута стыг.
Цень прышоў—
Край адбудаваўся,
Прайшоў навалу жах, варожы звон
Вось, замест мінулых катавасій,
Зьмяцца кола нячуваных дзён.
Былі. Жывем.
Пацнець штогодна будзем,
Гладзем цагліны ў вялізарны мур,
Стальне шчырае асілку—Асінбуду,
Што маяком узьнёсься пасьля бур!
Рабочыя пасёлкі.
Сталь. Бэтоны.
... Стаўрэнне электра правадзіў!

Індустрыяй абуджаныя дні.
І нас камун спатканць шчыра дзьверы,
І ўвойдзем мы туды працоўнаю сям'ёй.
Чарговы волатаў —
У гэта цьвёрда верым! —
Паўстане шмат над нашаю зямлёй!
Туман вякоў, машынам пакарыся.
Тут кожны з нас — рабочы і паэт.
Ў шалёным гудзе колаў і трансьмісій
Згарыць дашчэнту
Адыйшоўшы сьвет.

Расьцьвіло і надзейна і удала
Што справдзеж не ў пашане было,—
Экскватрнаю навалай—
Па туманах Аршанскіх балот!

Так і час наш—
Агні ды паўстанкі,
І лянім непахісным строем;
Папярэдні Заўтрага ранку
Сілы, мужнасьць—падвоім, патроім!

Кішень працы—на безьліч адсоткаў
Уздымаем на якасьці ўверх.
— «За чатыры гады пяцігодку»—
Гэтым лёзунгам дыхаем, верым!

Як паклічуць —
Мы кроў свае вен там
Без вагаваньняў і сполаху выльлем,
І «сваім» і чужым інтэрвэнтам
Адсячэм гругановыя крыльлі!

Надзвычайная, пекная восень,
Быццам бронзаю—ліст да ліста:
— Гэта сонца на новай дарозе,
Гэта наша жыцьцё —
Асінстан!

КАСТРЫЧНІК НА АСІНАЎСКІМ БАЛОЦЕ

Галоўны корпус Беларускай дзяржаўнай раённай электрастанцыі (Белдрэс) імя Сталіна грыміць і грукоча апошнімі ўдарамі. Шкляныя шырокія сьцены глядзяць ветліва, адбіваючы бліскучую паверхню возера Арэхі і зялёны дыван, маладых ляскоў і старых балот, мяжа якіх зьнікае далёка - далёка за кругавідам.

Грымяць у звонкім бэтоне апошнія ўдары. Сухарлявыя, спрытныя будаўнікі хутка лазяць па ўнутраных рыштаваньнях, сякерамі зьбіваюць брудныя дошкі, усё больш агаляючы зьвілістыя целы сталёвых і жалезных гігантаў, гатовых вось-вось задыхаць парывіста і горача, пасылаючы ва ўсе бакі павітраныя электра - цацалункі дзесяткамі старых і новых фабрык і заводаў.

Ціха сьлізгаюць пэндзлі маляроў. Першая Белдрэс упрыгожваецца: беліцца, малюецца, чысьціцца. Яна ведае, якою ўвагаю, якою любасьцю карыстаецца ў многіх мільёнаў працоўных БССР, з якою нецярплівасьцю ўсе чакаюць першага подыху гігантскіх турбін, першага шчасьлівага подыху народжанай у вялізарнейшых труднасьцях крыніцы новых перамог будаўнікоў сацыялізму.

Маленькія паравозікі, якія з вышыні галоўнага корпусу здаюцца цацачнымі, шпарка бегаюць ад чорных тарфяных гор да сьцен станцыі, цягнучы за сабор доўгі ланцужок гружаных вагончыкаў. Гэта рыхтуецца першае сьнеданьне першай Белдрэс. Гудзе электрычная лябёдка, тута нацягваецца цалёвы трос, павольна паўзе на 24-хметравую вышыню ваганетка, напоўненая чорным ацалам, моцныя рукі падхапляюць яе. асьцярожна падвозяць да разяўленых бункераў, няпрыкметным рухам адчыняюць яе бакі і сухі торф падае з глухім шумам уніз, у пражэрлівы зеў топкі паравога катла.

Яшчэ дзень-два і «Асінбуд першай чаргі» спыніць сваё існаваньне. Пачнецца эра першай Белдрэс і больш хуткімі тэмпамі разгорнецца пачатае ўжо будаўніцтва другой чаргі Асінбуду — сястры закончанай станцыі, якая павінна павялічыць магутнасьць першай больш, чым **у два разы.**

***

Кажуць, што вось тут, дзе мы зараз стаім, гадоў тры таму назад была непраходная балотная твань. Кажуць, што і там, дзе пракладзена шаша і чыгуначныя веткі, і вось там, дзе узьнімаецца будыніна Белдрэсу — увесь гэты прастор быў заліты балотнай вадой.

Мацней нагой цьвёрды камяністы грунт, аглядаеш прыгожыя шляхі зносін, цешыцеся выразнымі контурамі мнігіх камяніц і станцыі і ня верыш: нужо тут сапраўды ўсяго 3 гады таму назад была непраходная балотная твань?

Але з гады — тэрмін невялікі. Яшчэ зусім сьвежы ў памяці будаўнікоў Асінбуду першыя крокі іх па балоце. Кожную пядзь зямлі прыходзілася адваёўваць у няўмольнай прыроды нечалавечымі намаганьнямі. І калі-б ня 3, а 30 гадоў прайшло з таго часу, успаміны былі-б такімі-ж сьвежымі і выразнымі. Бо кожны дзень, кожная гадзіна пакідалі глыбокі сьлед у памяці змагароў за будучыню Белдрэсу, за будучыню БССР.

***

У дакументах гісторыі будаўніцтва Белдрэсу пачатак сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва датаваны красавіком 1929 году. Але гэта правільна будзе толькі ў тым выпадку, калі мы да ўдарнага руху на будаўніцтве падыдзем фармальна і будзем шукаць дня, калі афармілася першая ўдарная брыгада.

Але гэта будзе няправільна **па сутнасьці.** Ударная работа на Асінбудзе пачалася з прыездам першай групы будаўнікоў — на чале з кіраўніком усімі работамі — галоўным інжынэрам тав. **Алейнікавым.**

Вось што расказвае адзін з піянэраў будаўніцтва — інжынэр тав. **Рудэнскі.**

— Прыехалі мы сюды ў маі 1927 г. Мы — гэта невялікая група адміністрацыйна - тэхнічнага персаналу з 6-7 чалавек. Надыходзіла вялізарная работа. Пасёлак Вырыца складаўся з некалькіх дзесяткаў напалову развалёных дамоў — бяз даху і даху. У сувязі з тым, што асушальныя каналы былі запушчаны, балотная вада заліла ўсе прыязьбы дамоў, а некаторыя дамы сталі літаральна напалову ў вадзе. І ў гэтых дзіравых хатках жылі мясцовыя сяляне!..

У цяжкіх умовах позьняй восені, у мясцовасьці залітай вадой, былі праведзены першыя **будаўнічыя,** тэмпаў і дасьледчыя работы: капітальны рамонт чыгуначнай веткі, пабудова шашы, капітальны рамонт пасёлку Вырыца, пабудова часовай электрастанцыі, потым паніжальнай падстанцыі на торфараспрацоўках, капітальны рамонт пасёлку на торфараспрацоўках, пабудова пастаяннага пасёлку ў Арэхах, рад дасьледчых работ — вось прыблізна асноўнае, што было зроблена **за першыя месяцы.**

Капаньне асушальных каналаў рабілася мясцовымі рабочымі і сялянамі па пахі ў халоднай вадзе. Ня раз прымалі халодныя ванны і кіраўнікі работ, у тым ліку галоўны інжынэр тав. Алейнікаў. Рамонт грунтавой дарогі прыйшлося часова зусім спыніць, бо гальлё, якім гацілі дрыгву, пасьля першага дажджу правалювалася ў балотнае бяздоньне.

У яшчэ больш цяжкіх умовах ішлі будаўнічыя работы на Асінаўскім тарфяным балоце. Дарога ад станцыі Асінаўка да Асінторфу пралягала сабой суцэльную дрыгву. Паніжальную падстанцыю прышлося будаваць узімку, бо толькі 20-градусны мароз быў у стане пракласьці ледзяны мост на гразкім балоце і дзень магчымасьць падвезьці патрэбныя матэрыялы. Потым увесну пачалася тытанічная работа на пабудове вузкакалейкі, якая павінна была зьвязаць тарфяную базу Асінбуду са зьнешнім сьветам.

Успамінаючы пабудову вузкакалейкі, будаўнікі самі дзівяцца сваёй упартасьці і адвазе.

Дасьледчыя трасы вузкакалейкі паказалі, што ў 12 кілёмэтраў асноўнай магістралі, з кілёмэтры ідуць амаль непраходныя балоты, а 9 — знаходзяцца пад вадой. Дасьледчай партыі прышлося перажыць гэту ацлегласьць, ідучы на горла ў вадзе, вымяраючы глыбіню дна ўласным целам, бо нівэлірныя прыборы на было на чым паставіць.

Галоўнае, трэба было ўсё гэта рабіць у хуткім тэмпе, бо ня ўсе ішлі будаўнікі, ня ўсе ішлі, ня ўсе ішлі, ня ўсе ішл

НАПЕРАД, ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ

У ЗМАГАНЬНІ ЗА СУЦЭЛЬНУЮ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЮ І ЛІКВІДАЦЫЮ КУЛАЦТВА, ЯК КЛЯСЫ,

на гэтай аснове АГОНЬ ПА ПРАВЫХ І „ЛЕВЫХ“ АПАРТУНІС

76000

НОВЫХ КАЛГАСНЫХ ГАСПАДАРАК

Пад кіраўніцтвам КП(б)Б і яе ЦК калгасы БССР ідуць да новых баёў за суцэльную калектывізацыю.

За пяць год сельская гаспадарка Амэрыкі пры высокай мэханізацыі, пры выкарыстаньні каля 1 млн. трактараў, 45 тыс. камбайнаў і 800 тыс. грузавых аўтамабіляў здолела павялічыць выхад сельска-гаспадарчай прадукцыі толькі на 13,7 проц. Гэта значыць, што гадавы сярэдні прырост складае 2,7 проц. Вось тэмп росту сельскае гаспадаркі самай перадавой капіталістычнай краіны.

КАЛГАСЬНІКІ БССР, УЧАРАЙШЫЯ АДЗІНААСОБНІКІ, АБ'ЯДНАЎШЫСЯ Ў КАЛГАСЫ, ТОЛЬКІ Ў ВЫНІКУ СКЛАДАНЬНЯ СВАІХ ПРОСТЫХ СРОДКАЎ ВЫТВОРЧАСЬЦІ, У ВЫНІКУ КАЛЕКТЫЎНАГА ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ПЕРШАЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ СЯЎБЫ, ЗДОЛЕЛІ ПАВЯЛІЧЫЦЬ УРАДЖАЙ НА 20 ПРОЦ., ПАРАЎНАЛЬНА З УРАДЖАЕМ АДЗІНААСОБНЫХ ГАСПАДАРАК, А ТАВАРНАЯ ПРАДУКЦЫЯ КАЛГАСАЎ ПАВЯЛІЧЫЛАСЯ Ў ПАЎТАРА РАЗА. Вось тэмпы росту сацыялістычнага сэктару сельскае гаспадаркі пралетарскай краіны.

Што забяспечыла такія тэмпы?

Адказ на гэта пытаньне мы знаходзім у перавагах савецкай сыстэмы гаспадаркі, у перавагах калектыўнае гаспадаркі на толькі паралельна з індывідуальнай гаспадаркай, але і з буйной капіталістычнай, у якой работа праводзіцца на аснове эксплёатацыі, дзе рабочыя працуюць на капіталістага, на вобшарніка; адказ мы знаходзім у вызначальнай сродкаў вытворчасьці ў прамысловасьці і сельскай гаспадарцы ад капіталістычных манаполяў. Вось тое галоўнае, што дае магчымасьць рабочай клясе, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, нябывалымі ў гісторыі чалавецтва тэмпамі разгортваць індустрыялізацыю краіны і праводзіць на гэтай аснове сацыялістычную рэканструкцыю сельскае гаспадаркі.

Камуністычная партыя, наперакор процідзеяньням правай апазыцыі, з бальшавіцкай упартасьцю выконвае задачу індустрыялізацыі краіны, якая зьяўляецца асновай сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі. Да XIII гадавіны мы прыходзім не толькі з буйнейшымі посьпехамі ў галіне індустрыялізацыі, але і ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, дасягнутымі пад кіраўніцтвам партыі. КП(б)Б, рашуча змагаючыся за генэральную лінію партыі супроць правага апартунізму—галоўнай небяспекі, супроць «левых» загібаў, праводзячы рашучую барацьбу з прышчэпаўшчынай, гэтым беларускім філіялам кандрацьцеўшчыны,—дасягнула, на аснове ленінскіх прынцыпаў, вялікіх посьпехаў у калгасным будаўніцтве.

Лік калгасаў БССР да XIII гадавіны з 1.717 (на 1 кастрычніка 1929 г.) павялічыўся да 3.390. Колькасьць калектывізаваных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак за гэты час з 24.000 павялічылася да 100.000. Тэмп калектывізацыі з кожным днём нарастае. Нарастае магутная хваля калгаснага руху, якая зьмятае і канчаткова зьмяце на сваім шляху супраціўленьне кулацтва, супраціўленьне клясавага ворага, які шалёна абараняе свае пазыцыі. ПЕРАМОГА СПРАВЫ СУЦЭЛЬНАЙ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ ЗАБЯСПЕЧАНА. КУЛАЦТВА БУДЗЕ ЛІКВІДАВАНА ЯК КЛЯСА. НА АСНОВЕ СУЦЭЛЬНАЙ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ.

Аб узрастаючых тэмпах калектывізацыі сьведчыць хаця-б наступныя лічбы. У дні калектывізацыі і ўраджаю толькі па 27-мі раёнах арганізавана 97 новых калгасаў і ўцягнута ў арцелі 3.000 сялянскіх гаспадарак. Гэта зьяўляецца лепшым доказам агентуры кулацтва ў радах партыі—правым капітулянтам, якія дамагаюць купаку ў яго барацьбе супроць калгаснага будаўніцтва, якія пачна прадракалі «крах» калектывізацыі.

Пад выразным партыйным кіраўніцтвам калгасы, ліквідуючы выпадкі замучанасьці, разгортваюць шырокую работу па далейшым калектывізацыі. Толькі ў 27-мі раёнах створана ў калгасах больш 270 вытворчых камісій, 1.000 калгасьнікаў гэтых раёнах разгортваюць вярбоўку новых членаў.

Усюды шырэй разгортваецца сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва. Толькі апошнюю дэкаду ў калгасах створана каля 500 ударных брыгад, дзе ўдараюць да 6.000 калгасьнікаў. Ужо ў першы год свайго існаваньня калгасы паказалі перавагу калектыўнае гаспадаркі. Удзельная вага валавой прадукцыі калгасаў складае каля 30 проц., у той час, калі па пасёўнай плошчы яны займаюць толькі каля 15 проц. Рэзультаты калектыўнае працы ўтлумачэньнем пацьверджаньнем таго, што ліквідацыі заваяньні на харчовым фронце можна толькі на аснове фарсаванага будаўніцтва саўгасаў і хутчэйшай калектывізацыі сельскае гаспадаркі.

Разгавы апартунізм застаецца галоўнай перашкодай і таму галоўны агонь павінны накіраваны з яшчэ большай ідэалёгіі і практыцы правага ухілу ў калгасным руху. Адначасова ў корані перасякаць усялякія «левацкіх» загібаў, трэба бязьлітасную барацьбу з апартуністымі.

Наша задача—усямерна ўзмацняючы ведучыя калгасы, няўхільна паляпшаючы выразную арганізацыю працы ў калгасах, бязьлітасна наступаць на кулацтва, змагацца за далейшы ўздым калгаснага руху, за новы калгасны ліквідацыі.

XIII гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі калгасная маса сустрэне новымі дасягненьнямі, новымі тысячамі калгасьнікаў, шырокім разгортваньнем спаборніцтва, выкананьнем і перавыкананьнем рашэньняў барацьбы з кулацтвам і іншымі.

С. ЦЫГАНОЎ.

Усю зіму ішло завостранае змаганьне. Пяць радзееўскіх кулакоў і дзесятак кулацкіх падпявал адзіным фронтам наступалі на мясцовы актыў. Ад мэтадаў адкрытай вайны і агіднага цкаваньня супраціўнік пераходзіў да падпольнай агітацыі і ананімных пагроз. Вораг дарэмна прабаваў зьбіць актыў з пазыцый. Некалькі радзееўскіх камуністых і перадавых беднякоў працавалі дні і ночы, паволна, але няўхільна ідучы да мэты.

Карпенка Міхась, сакратар ячэйкі

...Калі сераднік Міхей Банузоў цьвёрда парашыў ісьці ў калгас, суседзі-заможнікі пачаў агітаваць жонку Міхея. Прабаваў запалохаць і самага Банузова:

— Эх дурань, увесну будзе вайна. Прыдуць палякі — заліне ваш калгас.

Міхей нічога не адказаў і на другі дзень панёс заяву. Не дапамог і бунт жонкі. Банузоў самаадлана ўзяўся за работу ў калгасе, рамантуючы калгасны інвэнтар да першай калектыўнай веснавой сяўбы.

За Міхеем пайшлі і другія сераднякі.

... Была вясна, калі радзееўскі актыў зрабіў сваю першую памылку. Яму здавалася, што вёска перайшла ўжо праз другі этап, што ўвесь сельсавет ідзе бяз хістаньняў у калгас. Посьпехі закружылі галавы перадавіком Лапіцкага сельсавету. У пагоні за стопроцантнай калектывізацыяй Лапіч і абагульненьнем кароў, яны забылі аб прынцыпе добраахвотнасьці.

Пасьля артыкулу тав. Сталіна мясцовыя партыйцы хутка ўсьвядомілі свае памылкі і з сапраўднай бальшавіцкай рашучасьцю ўзяліся за іх выпраўленьне. Яны ня выпусьцілі кіраўніцтва са сваіх рук, не спалохаліся, а павялі гэраічную работу, гэраічнае змаганьне за завяршэньне пазыцый.

Ізноў лапіцкі актыў дні і ночы змагаўся за кожны калгасны двор, за кожнага абагулепага каня. Нікога не затрымлівалі сілай, але зноў пераконвалі і даводзілі.

„Зразумеў я калгасную лінію, таварышы“

Так нарадзілася сельска-гасп. арцель «ЭНГЕЛЬС», адна з буйнейшых у БССР. З веснавой буры яна вышла ўмацаванай і гатовай да далейшага змаганьня. «Энгельс» аб'ядноўвае усю вёску Радзеева (за выключэньнем аднаго двара) — 210 гаспадарак і 3 карлікавыя калгасы Лапіцкага сельсавету, якія налічвалі 46 сем'яў. Усяго 256 двароў—1.278 чалавек, з якіх 710 працаздольных. Плошча калгасу—3.700 га.

Партыйная ячэйка, стаўшы на чале калгаснай будоўлі, зразумела, што асноўнай зарукай перамогі зьяўляецца правільная арганізацыя працы, правільныя ўзаемаадносіны з сераднякам. Яна адразу павярнулася тварам да калгаснага жыцьця. Калгасная парт'ячэйка вылучыла ў склад праўленьня 3-х лепшых сераднякоў. Іх багатая гаспадарчая практыка выкарыстоўваецца цалкам. І сапраўды Ягор Карпанка паказаў сябе дасканалым кіраўніком наліводзтва. Ва памылілася ячэйка ў вылучэньні Ахупрэя Ўсевіча на пасаду кіраўніка будаўніцтва. Замацаваньне блёку з сераднякам прынесла арцелі вялізарную карысьць. Сераднік стаў працаваць большую зацікаўленасьць і актыўнасьць у калгасным будаўніцтве, агітаваць за калгас у асяродзішчы сераднякоў-адзінаасобнікаў.

Партыйцы «Энгельса» павялі вялікую масавую работу сярод беднаты. Адчыліся дзесяткі схоладу беднаты, дзе сталі рознастайныя палітычныя і гаспадарчыя пытаньні. Актыўнасьць беднякоў - калгасьнікаў «Энгельса» расла. Апіраючыся на бедчату, кіраўніцтва вяло з посьпехам змаганьне з уплывам кулацкіх элемэнтаў.

Ажыцьцяўленьне гэтых мерапрыемстваў плюс найшырэйшае разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва дало арцелі бліскучую перамогу. Плян першай калектыўнай сяўбы быў выкананы раней тэрміну з перавышэньнем на 25 процантаў.

Клясавы вораг, прабуючы разваліць арцель, уплываў на найменш устойлівую і несьвядомую частку калгасьнікаў. 7 бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак, пад уплывам кулацкай агітацыі, сваімі нікуды нявартымі паводзінамі абуралі ўсю калгасную масу. У самы разгар сяўбы, калі лішняя пара рабочых рук расцэньвалася на вагу золата, яны ня выходзілі на поле і блыталі ўсе пляны брыгадзіраў. Гэтыя 14 гаспадарак пад дыктоўку кулацкіх элемэнтаў сталі весьці антыкалгасную агітацыю, знаходзячыся ў калгасе:

— Калі будзем у калгасе, апухнем з голаду...

Некалькі раз яны падавалі заявы аб выхадзе і столькі-ж раз назаўтра бралі гэтыя заявы назад. Калгасная маса, якая гарэла энтузіязмам і жаданьнем працаваць, патрабавала ад кіраўніцтва рашучых мер. Кіраўніцтва калгасу і актыў былі цярплівымі, яны дзень-у-дзень пераконвалі гэтую групу. Нарэшце, 14 сем'яў прышлося выключыць.

Прайшло некалькі тыдняў. Выключаныя са сьпіску калгасу 14 сем'яў, на дзіва ўсім, з першага-ж дня выключэньня пачалі акуратна і своечасова выходзіць на калгасную работу, ня ставячы ніякіх умоў, падпарадкоўваючыся калгаснай дысцыпліне. А калі пачалася ўборка, блін з выключных, Кірэенка Пятрусь дчышоў у праўленьне і патрабаваў заяву. У якой красе зноў прыняць яго ў рады калгасьнікаў.

На агульным сходзе калгасьнікі патрабавалі ад Пятруся шчырага прызнаньня сваіх памылак.

— Прызнаю, што вінаваты,—гаварыў Елісеенка на сходзе, — зразумеў я калгасную лінію, таварышы!

За Пятрусём зьявіўся і Апанасенка Павал, абяцаючы быць прыкладным калгасьнікам. Рэшта — 12 гаспадарак —яшчэ не падалі заяў, але ня сёньня-заўтра яны зноў будуць у калгасе.

У баёх за тэмпы

Усё лета ішла ліхаманкавая будоўля. «Энгельс» спэцыялізаваўся ў буйную малочную гаспадарку. Будаваліся двары для скаціны, сіласныя вежы. На працягу аднаго году «Энгельс» павінен стаць буйнейшай малочнай фэрмай Гомельшчыны. 2.000 малочных кароў — вось заданьне арцелі да 1931 году. 700 штук буйной рагатай жывёлы пастаўлены ўжо ў аборах «Энгельса». 500 штук маладняка ўжо галуецца радзееўскімі калгасьнікамі.

«Энгельс» не атрымаў ні аднаго трактара. Рабочай скаціны не хапае. Калгасьнікі разумелі, што па ўборачную кампанію яны спаткаюць шмат труднасьцяй. І таму з яшчэ большым энтузіязмам, чым увесну, яны ўзяліся за работу. З 710 працаздольных 700 абвясьцілі сябе ўдарнікамі. Калгасьнікі на 3 месяцы скасавалі ўсе сьвяты, аднадушна адмовіліся ад выхадных дзён. Усе 256 гаспадарак адмовіліся ад індывідуальнай уборкі ўраджаю азімых, засеяных да арганізацыі калгасу. Убіралі калектыўна.

«Энгельс» адным з першых у Беларусі закончыў асеннюю сяўбу. Засеяў 320 га азімага жыта, перавысіўшы плян на 20 гэктараў. Да кастрычніка былі пабудаваны 2 сіласныя вежы і адна трансэя. Лён поўнасьцю ўбраны. Фарсуецца будаўніцтва. Пачалося ворыва пад зяблева.

Была пагроза прарыву ва ўборцы бульбы. 320 гэктараў бульбы—гэта ня жарты. Асабліва калі ў дні ўборкі ідуць дажджы і чакаецца наступленьне замаразкаў. Але калгасьнікі памяталі свае абяцаньне ў адказ на верасьнёўскую вдзову ЦК — ліквідаваць прарывы да дня калектывізацыі і ўдзесяцярылі тэмпы.

— Будзем працаваць круглыя суткі, а бульбу выкапаем самі, давядзем, што «Энгельс» — сапраўдны калгас, — паращылі радзееўцы.

На бульбяны фронт былі кінуты ўсе сілы. Нават старыя не засталіся ў хатах. Ад цямна да цямна на палёх ішло гэраічнае змаганьне за бульбу. Адзінаасобнікі дзівіліся і гаварылі:

— Гэта нейкія вар'яты, так не працуе ніхто.

Пунктуальна да тэрміну — 18 кастрычніка ўвесь вялікі бульбяны клін быў убраны.

Па колькасьці і якасьці працы

Пайковая «тэорыя» кулака, пры дапамозе якое ён прабаваў пахіснуць давер'е дадзееўцаў да калгасу, у «Энгельсе» ніякім посьпехам не карысталася. Кулацкія плёткі разьбіваліся аб вялікую масавую работу партыйнай ячэйкі. Калі перад сяўбой азімых быў абгавораны парадак разьмеркаваньня ўраджаю, «горыя» пайка пацярпела поўнае паражэньне. Нават 80-гадовы вартаўнік саду добра разумее, што ніякай зарплаты і пайка ён не атрымлівае.

— Усё наша, калгасьнікаў. Як працуем, так і атрымліваем. Што зьбярём, тое і падзелім.

Аб гэтым - жа ведалі ўсе калгасьнікі, калі сеялі азіміну, калі амаль круглыя суткі змагаліся за бульбу. Восем вечароў радзееўцы абмяркоўвалі вынікі калектыўнае працы. Нават даволі прыбліжныя падлікі маляваді вялізарныя посьпехі калектыўнае гаспадаркі. Калгасная маса ясна бачыла, што гэта рэзультат простага складаньня звычайных сялянскіх прылад, памножанага на сацыялістычную арганізацыю працы і вытворчасьці. Новым было толькі тое, што працавалі калектыўна, ды ўжылі некалькі агранамічных мерапрыемстваў. «Энгельс», між іншым, ніяко не атрымаў ні 1 гэктараў, ні бушых с.-г. машын. І ўсё-ж самы мінімальны рэзультат—271.374 руб. валавога даходу па цьвёрдых цэнах. За вылікам усіх аднічэньняў засталося 141.497 руб. чыстага прыбытку, які падлягае разьмеркаваньню сярод калгасьнікаў па колькасьці і якасьці затрачанае працы. Гэта значыць, што ў сярэднім на кожную гаспадарку прыпадае па 513 руб. Такой высокай прыбытковасьці ніколі не ведаў увесь Уваравіцкі раён.

Чысты прыбытак калгасьніка ў два разы перавышае прыбытак адзінаасобніка. Так, сям'я серадняка Васіленка пры 7-мі працаздольных павінна атрымаць 2.218 руб., сям'я Андрушкевіча пры 3-х працаздольных—860 руб. На сям'ю Васіленкі налічана 1.336 праца-дзён, а на сям'ю Андрушкевіча—539.

Гэты прыкладны падлік прымусіў падцягнуцца ўсіх тых, хто адставаў. Сераднік Музычэнка зразумеў, што калі ён не прыналяжала ў часе асеньняй сяўбы і ўборкі бульбы, дык атрымае на 1/3 менш за бедняка Барабанэва. У абодвух гэтых калгасьнікаў па 2 працаздольных члены сям'і, а вышла пасьля разьмеркаваньня ўраджаю, тое, што бедняку Барабнаву належыць 1.556 руб., а сераднику Музычэнка — толькі 1.171 руб. Увесь сакрэт у тым, што на першага налічана 950 працоўных дзён, а на другога—685. Барабанаў працаваў больш і лепш за Музычэнку.

Калі радзееўцы падзялілі ўмоўны прыбытак, разьмеркаваньне ўраджаю на сустрэча ніякіх затрудненьняў. Кожнаму было ясна, што яму належыць такая колькасьць натуральных прадуктаў, якая адпавядае ўмоўна налічанай калгасьніку сумі ў рублёх. Ураджай, за выключэньнем кулацкіх пасеваў, дзялілі паміж усімі калгасьнікамі, знаходзячы з колькасьці і якасьці затрачанай працы.

Выконваюцца калгасныя абавязацельствы перад краінай

Маладая арцель «Энгельс» бясспрэчна адзін з самых перадавых калгасаў Беларусі. «Энгельс» першым адклікаецца на заклік партыі і ўраду, падцягваючы іншыя калгасы, першым выконае свае калгасныя абавязацельствы перад краінай.

Довады.

Ні адзін калгасьнік не павёз на рынак азімага жыта, ня гледзячы на вялізарную розьніцу паміж загатоўчымі і спэкуляцыйнымі цэнамі. Калектыўна ўбраўшы індывідуальна засеянае жыта, калгасьнікі аднадушна парашылі—усе лішкі дзяржаве і здалі замест 200—400 цэнтнэраў. Калгасьнікі здаюць пралетарскай дзяржаве лішкі з долі калгаснага ўраджаю, якая належыць ім. І ў выніку «Энгельс» замест 410 цэнтнэраў яравых, паводле заданьня, здае 820 цэнтнэраў. Заданьне па збожжазагатоўках выконваецца на 200 проц.

Летась уся вёска Радзеева і наўкольныя пасёлкі амаль ня мелі таварнай прадукцыі. Ужо ў першы год існаваньня «Энгельса» выявілася вялізарная эфэктыўнасьць калектыўнае працы. Ужо зараз арцель адыгрывае важную ролю ў зьбесьпячэньні рабочых цэнтраў. Даволі адзначыць, што ў падарунак XIII гадавіне Кастрычніка «Энгельс» адгружае пралетарыяту Масквы і Ленінграду два эшалёны бульбы. Адзінаасобнікі насьмяхаліся з калгасьнікаў, калі яны вясной закладвалі прамысловы агарод.

— Дарэмна працуеце, нічога ня выйдзе.

Прыклад высокай палітычнай сьвядомасьці калгасьнікі паказалі, пастанавіўшы ў адказ на спробы шкодніку сарваць будаўніцтва сацыялізму падпісацца на пазыку «Пяцігодка за чатыры гады» ў разьмерах 3-хтыднёвага даходу кожнага працаздольнага.

Бальшавіцкай рабоце — бальшавіцкі плян

Калгасьнікі «Энгельса» адказалі на верасьнёўскую вдзову Цэнтральнага Камітэту УсесКП(б) найшырэйшым разгортваньнем ударніцтва. «Энгельс», пачынаючы з асеньняй сяўбы, стаў ударным калгасам. За ўсю асеньню с.-г. кампанію арцель ня ведала амаль выпадкаў навыхаду на работу на няўважлівых прычынах. Калгас адным з першых узяўся за выпрацоўку свайго калгаснага сустрэчнага пляну. Мэтады працоўкі пляну настолькі цікавыя, што на іх трэба спыніцца.

Федарэнка, старшыня праўленьня

Для таго, каб склаўшы рэальны сустрэчны, гарантаваны ад усякіх зьмяншэньняў плян, калгасьнікі парэшцілі стварыць спэцыяльныя плянавыя групы. Кожная брыгада вылучала сваю групу. Спачатку меркавалася арганізаваць плянавыя групы ў складзе 3—5 актыўнейшых членаў адпаведных брыгад. Калі-ж пачалася работа, дык у кожнай групе аказалася ня менш 50 калгасьнікаў. Брыгадзіры, ня ўключаныя ў члены груп, запрашаліся плянавікамі прыняць удзел у працы. Другія-ж самі па ўласнай ініцыятыве ішлі дапамагаць групам. У выніку ў плянавую работу быў уцягнут увесь калгасны актыў і нават такія калгасьнікі, якія раней адзначаліся сваёй пасыўнасьцю. Можна сьмела сказаць, што ў складаньні сустрэчнага пляну прымала самы актыўны ўдзел пераважная большасьць калгасьнікаў. Пры гэтым кожная прапанова, кожны праект, кожная дэталь пляну падпадала пад жорсткі ягонь усебаковай крытыкі. Выключную зацікаўленасьць праявілі старыя, якія лічылі сваім абавязкам выступіць з дзелавымі зьвагамі, угрунтаванымі на шматгадовым практычным вопыце. Шмат дапамаглі настаўнік і аграном, абодва спэцыяльныя грамадзкія работнікі.

Пастановы плянавых груп у асноўным заключаліся ў наступным:

Паляводная група знайшла магчымым павялічыць плян асеньняй сяўбы на 15—20 гэктараў, а плошчу збожжавых яравых будучага году—на 25 га і плошчу ільну на 6 гэктараў.

Сустрэчны плян у частцы азімых пасеваў ужо ажыцьцяўлены цалкам.

Жывёлагадоўчая група выпрацавала рад практычных мерапрыемстваў па паляпшэньні догляду за жывёлай. Пры яе ўдзеле будаўнічая група дакладна абмеркавала праграму будаўніцтва. Абедзьве групы выказаліся за тое, што можна і трэба ўжо зараз пачаць пабудову дзьвёх новых абор, хлява для цялят на 200 штук і сьвінарніка на 150 сьвіней. Характэрна, што вытворчым плянам калгасу гэта работа прадугледжана толькі з будучай вясны. Пастановы абедзьвюх груп праводзяцца ў жыцьцё.

Вытворчы плян прадугледжвае заняцьцяй гэтай восеньню 75 гэктараў саду. Садова - гародная група прыйшла да заключэньня, што больш эфэктыўна арабіць гэта ўвесну, а зараз як склад падрыхтаваць: капаць ямы, рыхтаваць матар'ялы і г. д.

Настойлівыя патрабаваньні і прад'явіла плянавая група пчалярства. Яна давяла магчымасьць і патрэбнасьць павялічэньня колькасьці вульлёў са 100 да 200 і ўключэньне ў праграму будаўніцтва будаўнічых работа па лініі пчалярства.

Найбольшую зацікаўленасьць праявілі калгасьнікі да работы плянавай групы па арганізацыі працы. На аснове практыкі веснавой сяўбы, група прапанавала рэарганізаваць мэтам камплектаваньня брыгад, падвоіўшы іх колькасьць. Меркаваньні былі наступныя: меншая лікам брыгада будзе працаваць інтэнсыўней, кіраўніцтва яе работай палепшыцца, будзе забясьпечана больш вузкая і выразная спэцыялізацыя калгасьнікаў. Практычна гэта азначала, што замест 60 чалавек у брыгадзе павінна быць толькі 30—35. Такое разьмеркаваньне значна палягчае вядзеньне правільнага ўліку. Група прапанавала весьці спэцыяльныя карткі на калгасьнікаў, дзе адзначаць колькасьць прапрацаваных імі дзён і галзін з паказаньнем якасьці работы. Кожны месяц гэтыя весткі заносяцца ў асабісты табэль кожнага калгасьніка.

Прапановы ўсіх плянавых груп былі потым абмеркаваны на агульным сходзе калгасьнікаў і аднагалосна зацьверджаны. Прыняўшы сустрэчны плян, энгельсаўцы па-бальшавіцку ўзяліся за яго ажыцьцяўленьне. Аб гэтым сьведчыць ударнае і своечасовае правядзеньне асеньняй с.-г. кампаніі і фарсаваны ход будаўніцтва.

Наперакор кулацкай праваапартуністычнай тэорыі аб „гультаі“

У калгасе «Энгельс» былі ня раз адзначаны спробы кулацкіх элемэнтаў паспарыць сераднякам з бедняком. Кулак імкнуўся давесьці сераднику, што бядняк сядзіць на яго шыі ў калгасе, што бядняк-калгасьнік —«гультай». Сярэдняя тэорыя клясавага ворага даволі актыўна прапаведуецца праваапартуністычнымі элемэнтамі. Практыка калгаснага будаўніцтва за апошнае паўгодзьдзе выявіла цэлы рад фактаў, калі правыя апартуністы, на аснове кулацкага лёзунгу аб «гультаі» адкрыта зачынялі дзьверы калгасаў перад беднатой. Пасобныя калгасьнікі, пад кіраўніцтвам — правых апартуністых розка адгароджваліся ад беднякоў-адзінаасобнікаў.

Нават павярхоўны аналіз працоўных узаемаадносін паміж сераднякамі і беднякамі ў арцелі «Энгельс» упэўнт разьбівае гэту праваапартуністычную кулацкую «тэорыю». Ні адзін сераднякі-калгасьнік «Энгельса», працуючы рука ў руку з суседам-сераднякам на калгасным полі, ні ў якім разе ня скажа, што бядняк працуе горш за яго, што бядняк менш зацікаўлен у калектыўнай працы. Самае бесстароннае, зусім аб'ектыўнае прадстаўленьне, аднак, дае кніга асабістых рахункаў калгасьнікаў. Падамо некалькі выпятак, узятых у парадку запісаў за красавік, май, чэрвень, ліпень месяцы:

Грышчанка Анісім. Сераднік. 4 працаздольныя. Прапрацавана 295 працоўных дзён. Барвёнка Апанас. Бядняк. 4 працаздольныя. Прапрацавана 368 прац. дзён. Бунузоў Давыд. Сераднік. 4 працаздольныя. Прапрацаванэ 338 працоўн. дзён.

Наперадзе ідзе бядняк Барвёнка. Сераднік Банузоў нязначна адстаў. Сераднік Грышчанка далёка ззаду.

Казлоў Тодар. Бядняк. 3 працаздольн. 1 падростак. Прапрацавана 204 пр. дзён. Севасьцянаў Якуб. Сераднік. 3 працазд. 1 падростак. Прапрацавана 266 пр. дзён.

Наперадзе — сераднік Севасьцянаў. Бядняк Казлоў адстае.

Раманаў Абрам. Бядняк. 3 працаздольныя. Прапрацавана 225 працоўных дзён. Карпенка Архіп. Сераднік. 3 працаздольныя. Прапрацавана 252 прац. дні.

Спачатку здаецца, што адстае бядняк Раманаў. Але ў сапраўднасьці гэта ня так. Увесь сакрэт у тым, што жонка Карпенка занята на пастаяннай рабоце — доіць кароў. Яна на працягу ўсяго лета працавала па 30 дзён кожны месяц. Сям'я-ж Раманава перакідвалася з аднэй работы на другую. Ня ўсе члены сям'і заўсёды мелі поўную нагрузку.

Макарэнка Кастусь. Сераднік. 2 працаздольныя. Прапрацавана 185 прац. дзён. Кузьмянкоў Фядос. Бядняк. 2 працаздольныя. Прапрацавана 182 працоўныя дні. Матвеенка Наста. Бяднячка. 2 працаздольныя. Прапрацавана 222 прац. дні.

І так, інтэнсыўней за ўсіх працавала сям'я бяднячкі Матвеенка. Сераднік Макарэнка займае другое месца. Амаль на такім-жа ўзроўні сям'я бедняка Кузьмянкова.

Вывад ясны. Бядняк працуе ні ў якім разе ня горш за серадняка, а часамі значна лепш і за асобных прыкладных сераднякоў.

Баявы арганізатар новага калгаснага прыліву

Ня прыходзіцца даводзіць, што «Энгельс» зьяўляецца буйнейшым фактарам калектывізацыі ва Ўраваўіцкім раёне. Вялізарныя гаспадарчыя посьпехі арцелі, правільныя ўзаемаадносіны з сераднякам, ударная, арганізаваная праца калгасьнікаў, працоўныя ўзаемаадносіны паміж сераднякам і бедняком, пераможныя вынікі разьмеркаваньня ўраджаю і прыбыткаў — усё гэта добра вядома ваколічнаму адзінаасобніку, які пільна сочыць за жыцьцём і работай калгасьнікаў. Калгас «Энгельс» добра ўсьвядоміў дырэктывы партыі аб уцягненьні адзінаасобных бядняцка-серадняцкіх мас у калектывы. Калгас пабальшавіцку рыхтуе і арганізуе новы калгасны прыліў.

Пад кіраўніцтвам партыйнай ячэйкі арцель разгарнула вялікую масавую работу сярод адзінаасобнікаў. У часе асеньняй сяўбы ў «Энгельс» уступіла 12 новых гаспадарак. Гэта вынік справаздачнай кампаніі арцелі перад адзінаасобнікамі. Калгас дае вялікую дапамогу адзінаасобнікам: адпусьціў каля 250 цэнтнэраў яўсу бедняком і маламоцным сераднякам, дапамог ім убіраць азімыя і яравыя пасевы. Калгасьнікі арганізавалі два абозы для абмалоту ўраджаю азімых адзінаасобнікаў.

Да дня «калектывізацыі і ўраджаю» калгас «Энгельс» па-баявому разгортвае масавую работу, стварыўшы з калгасьнікаў ударныя групы вярбоўшчыкаў калектывізацыі, арганізаваў дзьве новыя с.-г. арцелі. Актыў «Энгельса» доўга і ўпарта змагаўся пакуль дабіўся гэтага вялізарнага посьпеху. Арганізацыйны двух новых калгасаў «Энгельс» у значнай ступені абавязан сваім вярбоўвачным камісіям, якія разгарнулі сярод адзінаасобнікаў найшырэйшую работу. Сіламі «Энгельса» ў суседніх вёсках створаны ініцыятыўныя групы па арганізацыі новых калгасаў.

Першы калгас быў створан у вёсцы Якіменкі. Вярбоўчая камісія «Энгельса» доўга прыглядалася да сялян вёскі Якіменкі, пакуль не знайшла патрэбнага актыву, пры дапамозе якога можна было-б арганізаваць ініцыятыўную групу. У гэты актыў увайшлі дэмабілізаваны чырвонаармеец і член сельсавету. Яны павялі работу сярод сваіх аднавяскоўцаў. Да сканчэньня асеньняй сяўбы ініцыятыўная група, арганізаваная вярбоўчай камісіяй «Энгельса», ужо налічвала 7 чалавек, якія працягвалі індывідуальна апрацоўваць кожнага адзінаасобніка. Вынік змаганьня забясьпечыла вярбоўчая камісія арцелі «Энгельс», наставіўшы ў гэтай вёсцы справаздачу аб рабоце свайго калгасу. Пасьля гэтага ў калгас запісалася амаль уся вёска — 22 двары. Новыя калгасьнікі калектыўна прапрацавалі статут с.-г. арцелі і ўпяршыню ў сваім жыцьці выйшлі арэц свае індывідуальныя палоскі пад калектыўнае зяблева ў адну калгасную баразну.

Прыкладна пры такіх абставінах быў арганізаваны калгас і ў вёсцы Пыцьковічы. Тут, праўда, вярбоўчая камісія і ініцыятыўная група наткнуліся на шалёную антыкалгасную агітацыю кулацкіх элемэнтаў, якія ўсімі сіламі ўсімі сродкамі прабавалі сарваць арганізацыю калгасу. На агульным сходзе кулакі і падкулачнікі прабавалі запалохаць беднякоў і сераднякоў такога роду дэмагагічнымі выкрыкамі:

— У калгасе эксплёатуюць сялян, не даюць адпачыць. Усё баявыя тэмпы!

Гэтыя выпады клясавага ворага сустрэлі належны адпор з боку саміх-жа беднякоў і сераднякоў вёскі Пыцьковічы. На практыцы работы калгасу «Энгельс» яны бачылі, якія магутныя перавагі мае калектыўная гаспадарка над дробнай індывідуальнай, які вялікі прыбытак параўнальна з іхнім атрымліваюць калгасьнікі. Пыцьковічы ведалі, што энгельсаўцы дабіліся сваіх посьпехаў у выніку працоўнага энтузіязму, у выніку калектыўнае працы, што ўсякія плёткі аб «эксплёатацыі» — кулацкая хлусьня.

... У той-жа вечар у Пыцьковічах быў арганізаваны калгас.

Апошні з магікан

За апошні час Карпенка Сьцяпан — апошні адзінаасобнік у вёсцы Радзеева — некалькі раз падаваў заяву ў праўленьне калгасу. Прасіў прыняць у члены калектыву. Сам Карпенка ніколі ня быў супроць калгасу. Яго сьцягнула з калгаснага шляху жонка Аўдоцьця. Гэта яна ўсю вясну енчыла: «Не хачу ў калгас, разьвядуся». Так і пражыла лета сям'я Карпенкі на сваёй індывідуальнай палосцы сярод калгасьнікаў. Усю вясну Аўдоцьця прадракала суседкам-калгасьніцам дрэнны канец. А калі ўбіралі авёс і калгасьнікі разьмеркавалі ўраджай, Аўдоцьця раптам сьціхла. Дома яна пачала грузьці свайго мужа:

— Чаму ня ідзеш у калгас?

Сьцяпан падае заяву за заявай, а адказу не атрымлівае. Праўленьне не гаворыць: «ні таго, ні сяго».

Чаму ня прымаюць Сьцяпана Карпенкі?

— Жонка яго, камандзір у хаце, — гавораць у калгасе. — Раней агітавала супроць арцелі, а зараз павярнула руль. Аўдоцьця цяпер найленьшы агітатар за калектыў, няхай папрацуе, нам лепш. Потым прымем.

Гэтай думцы нельга адмовіць у арыгінальнасьці. Аднак, усякі жарт мае свой канец. Праўда, Аўдоцьця, несьвядомая сялянка, была супроць калгасу, але праўда і тое, што яна ўсьвядоміла сваю памылку і сама просіць прыняць яе ў арцель, сама агітуе за калектыў. Яна, Аўдоцьця Карпенка, заваявала права быць у калектыве і яна будзе ў калгасе.

**

Кастрычнік зламаў векавыя падпоры старой цёмнай Радзееўкі, зараў у адно поле 210 дробных сялянскіх паносак, зруйнаваў стары аджыўшы быт.

Кастрычнік перамог!

Перамог калгас!

Ул. Лілін

АД РЭДАКЦЫІ: Калгас «Энгельс» атрымаў першую прэмію на Усебеларускай выстаўцы — трактар.

**За ўзорнае правядзеньне сельска-гаспадарчай кампаніі і перавыкананьне пляну збожжазагатовак Калгасц

ПРАЛЕТАРСКІЯ КАЛЁНЫ ЗМАГАРОУ

«Трэба прызнаць, што з усіх існуючых і магчымых прапагандыстых калгаснаго руху рабочыя-прапагандыстыя зьяўляюцца лепшымі прапагандыстымі сярод сялянскіх мас»
(СТАЛІН).

ЗА САЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ ПЕРАБУДОВУ ВЁСКІ

„АРГАНІЗУЕМ, КІРУЕМ І ВУЧЫМСЯ“

Рабочыя—25-тысячнікі ў абставінах абвостранай клясавай барацьбы, у змаганьні за разгортваньне і замацаваньне калектывізацыі далі сапраўдныя ўзоры пралетарскага кіраўніцтва.

Рашучы каварот бядняцка-серадняцкіх мас вёскі на шлях калектывізацыі, які надрыхтоўваўся ўсім ходам нашага разьвіцьця, высунуў перад партыяй і рабочай клясай праблему ўзмацненьня пралетарскага кіраўніцтва сацыялістычнай рэканструкцыяй сельскае гаспадаркі. Мерапрыемства партыі аб мабілізацыі 25.000 рабочых на кіруючую работу ў вёсцы абярнулася ў масавую палітычную кампанію. Гета кампанія прайшла з вялікім уздымам рабочых мас на прадпрыемствах. Рабочая клясa выдумла са сваіх радоў на калгаснакапіталістычную работу лепшых тавары-шоў, стоўпіх змагароў за генеральную лінію партыі.

Практыка 9-месячнай работы «25-тысячнікаў» на вёсцы дала вялікія станоўчыя вынікі ў справе замацаваньня і разьвіцьця калгаснага руху, у справе пераняцьня з вытворчасьці сацыялістычных форм і мэтадаў працы на калгасна - кааперацыйную сыстэму. Як актуальнае зьявішча, тыя калгасы БССР, у якіх на кіруючай работе знаходзяцца рабочыя з гораду, першымі ішлі ў радах по выкананьні о.-г. кампаніі. Аб гэтым сьведчаць сотні лістоў рабочых «25-тысячнікаў» і шматлікія допісы сялян-калгаснікаў.

З Багушэўскага раёну нам паведамляюць:

— Прасланы «25-тысячнік» ў поўнай меры сябе праўдзівы ангыўнай работай на калгасным будаўніцтве. **Калгасы «Чырвоны бераг» і «Лясная паляна», у якіх працуюць рабочыя, з посьпехам справіліся са сваімі гаспадарчымі задачамі.** Добрая арганізацыя працы, гаспадарчыя вынікі першага году існаваньня калгасаў выклікалі новы прыплыў адзіначасобных гаспадарак. «25-тысячнікі» карыстаюцца вялікім аўтарытэтам сярод калгаснікаў і сялян адзіначасобнікаў.

За час работы «25-тысячнікаў» тав. **Жыпінскага** калгас **«Чырвоны Кастрычнік»** (Чэрэйскі раён) ва колькасці гаспадарак **павялічыўся ў 2 з лап. разы, па плошчы—у 4 разы.** У калгасе імя Сталіна, дзякуючы энэргічнай работе тав. **Менакера**, плошча пашырана **на 162 гэкт., павялічылася** ў два-тры разы колькасьць рабочай і прадукцыйнай жывёлы. Разгорнута будаўніцтва жывёлёных памяшканьняў. Калгас аказвае гаспадарчую дапамогу суседнім калгасам і адзіначасовым бяднякам гаспадаркам. З такім посьпехам праходзіць работа амаль ва ўсіх калгасах, дзе працуюць рабочыя «25-тысячнікі».

Гаспадарчы эфект калгасаў, іх рост за лік новых адзіначасовых бяднякоў-серадняцкіх гаспадарак дазнаецца не самакіраўніцтвам, а правільнай арганізацыяй і разьмеркаваньнем рабочае сілы ў калгасах, укараненьнем у работу мэтадаў сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, заахвочаньнем лепшых на працы рабочых брыгад і асобных калгаснікаў, рацыянальным выкарыстаньнем калгаснае маемасьці і наладжаньнем правільных узаемаадносін паміж калгасамі і сялянамі-адзіначасобнікамі.

Рабочы тав. **Грозаў** з калгасу «Першамайск» (Вузьдзенскі раён) піша:

«Мэтадамі ўдарніцтва і спаборніцтва, добрай работай вытворчай нарады ў калгасе мы забясьпечылі своячасовае сканчэньне ўборачнай і пасеўнай кампаніі. За апошні час уступіла ў калгас 9 новых сямей.

— У калгасе **«БАЛЬШАВІК» (Слуцкі раён),—паведамляе тав. САПРЫКАЎ, — лепшыя брыгады прэміяваны, тыя брыгады, якія адставалі, былі ўзяты на грамадзкі буксір. Частка калгаснікаў, якая па сваёй адсталасьці раней нядбайна адносілася да работы, зараз падцягнулася і працуе як трэба.**

У другім калгасе таго-ж раёну, «Новае жыцьцё», дзе працуе «25-тысячнік» тав. Гуровіч, усе гаспадарчыя кампаніі праведзены ударным парадкам.

— Гаспадарчыя посьпехі калгасу **«Камінтэрн»** (Лупалаўскі раён),—паведамляе «25-тысячнік» тав. **Цуканаў,**— і праведзеная справаздачная кампанія зьявіліся штурмком для прыпіву ў калгас новых гаспадарак.

Рабочы гомельскага заводу імя Лапцуцкага тав. **Шэпэль** за 4 месяцы работы ў якасьці старшыні праўленьня калгасу «Чырвоная перамога» (Хойніцкі раён) **узьняў на належную вышыню працдысцыпліну, дабіўся сьвядомых адносін усіх калгаснікаў да працы і калгаснай маемасьці.**

Работа былога апартуністычнага кіраўніцтва **Камарынскага раёну** кенска адбівалася на становішчы калгасаў. У паасобных калгасах былі адлівы. З калгасу «Інтэрнацыянал» выйшлі 33 гаспадарні. Для замацаваньня калгасаў патрэбна была напружаная работа.

Парт'ячэйка, сакратаром якое зьяўляецца рабочы «25-тысячнік» тав. **Спавін** (ен-жа і член праўленьня калгасу), пабальшавіцку разгарнула работу сярод калгаснікаў. У выніку — уборка і сяўба праведзены своячасова. Агрэмаджана жыта летаняга пасеву. З часу асеннай сяўбы работа ў калгасе пераведзена **на зьдзельшчыну.** Калгас мае прыбытку 15.000 руб. Прыбытак калгаснікаў павялічыўся, параўнальна з мінулым, у два-тры разы.

Уменьшэнем арыентацыя на новай арганізацыйнай работе калгаснага будаўніцтва, выразнай клясавай лініяй, цярпілівымі і ўважлівымі адносінамі да запатрабаваньняў калгасных мас, усярыньцьцем ведаў у галіне сельскае гаспадаркі ад саміх калгаснікаў **рабочыя «25-тысячнікі» заваявалі поўнае давер'е і аўтарытэт сярод калгаснікаў і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі.**

— **Я заслужыў давер'е калгаснікаў і сялян адзіначасобнікаў,** — заяўляе **рабочы заводу «Чырвонае Сормава» тав. Маладаеў,** — **і дабіўся вялікіх посьпехаў у рабоце калгасу «Іскра» ня толькі правількай арыентоўкай у палітычных пытаньнях і праяўленьнем арганізацыйнай здольнасьці, а і таму, што сам многаму вучыўся ў калгаснікаў.**

Калі спачатку работы «25-тысячнікаў» у вёсцы сям-там праяўляліся ледаровыя адносіны да іх з боку адсталай часткі працоўнага сялянства, дык у працэсе работы гэта частка пераканалася ў беспадстаўнасьці сваіх думак, што «рабочы нічога не разумее ў сельскай гаспадарцы».

Калгаснікі насылалі прывітальныя тэлеграмы кіруючым арганізацыям тых прадпрыемстваў, якія вылучалі рабочых на работу ў калгасы. Можна наглядаць рад фактаў, калі калгаснікі зварачаліся да раённых кіруючых арганізацый з просьбамі прысылаць да іх на работу рабочых.

У вобе рабочых «25-тысячнікаў» вёска атрымала ўстойлівых эмігараў, неабсных праваднікоў палітыкі партыі па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе калектывізацыі.

* * *

Бузумоўна, посьпехі практычнага ажыцьцяўленьня баявых задач партыі на вёсцы ў значнай меры залежаць ад стварэньня адпаведных умоў дапамогі і правільнага кіраўніцтва работай «25-тысячнікаў» з боку мясцовых партыйных, савецкіх і калгасна - кааперацыйных арганізацый. У асноўным мясцовыя арганізацыі правільна ацэньваюць палітычнае значэньне і практычную работу «25-тысячнікаў» і ў адпаведнасьці з гэтым ім дапамагаюць. Аднак, у радзе месц наглядаюцца выпадкі няправільнага скарыстаньня «25-тысячнікаў», фармальна бюракратычныя адносіны да іх, не аддаецца патрэбнай увагі рабоце «25-тысячнікаў» і палапшэньню іх бытавых умоў.

Работніца фабрыкі «Чырвоны мазырэнін» тав. **Слуцкая** ў калгасе «Прагрэс» (Лельчыцкі раён) працуе толькі фізычна, ня маючы ніўпай галіны кіруючай работы. Між іншым, тав. Слуцкая зьяўляецца ініцыятарам арганізацыі ў калгасе сацыялістычнага спаборніцтва, як партыйка, прымае актыўны ўдзел ва ўсім грамадзкім жыцьці калгасу і карыстаецца вялікім аўтарытэтам сярод калгаснікаў.

Недапушчальна бюракратычныя адносіны да «25-тысячнікаў» праяўляюцца ў **Бягомльскім раёне.** Прызначаны на пасаду старшыні праўленьня раймалмысаюзу рабочы Эльводу тав. **Высоцкі** ня толькі ня меў штату, а нават і памяшканьня для гэтай установы. Калі т. Высоцкі зьвярнуўся за дапамогай, старшыня РВК **Русак** адказаў: «Не пырставай, на чорта вы нам здаліся, мы і бяз вас справімся з работай».

Пасьлі многіх перакідак і цяганьняў, тав. **Высоцкі апынуўся ў райсельбанку тахнічным работнікам.**

Паршывства ў сэнсе бязьдзейнасьці і бюракратычных адносін да «25-тысячнікаў» застасецца за кіраўніцтвам **Капыльскага раёну.** Там працуе сем «25-тысячнікаў». Замест жывога кіраўніцтва іх работай і дапамогі з боку адказных работнікаў раёну практыкуецца «дерганьне» і дыскрэдытацыя. Усё кіраўніцтва работай «25-тысячнікаў» з боку РВК выяўляецца толькі ў пасылцы цыркуляраў награжаючага зьместу: «за всякаваньне вамі нашага распараджэньня ў 3-хдзённы тэрмін вы будзеце адданы пад суд». А цыркуляры гэтыя трапляюць на месца пасьля таго, як «страшныя тэрміны» ўжо пройдуць.

Партыйныя арганізацыі на месцах павінны рашуча змагацца супроць недапушчальнай тэй ролі, якую адыгрываюць «25-тысячнікі» ў справе калгаснага будаўніцтва, і ўсямерна садзейнічаць і дапамагаць у іх рабоце. Усякія праявы бюракратычных адносін да «25-тысячнікаў» павінны сустракацца руйнуючым агнём бальшавіцкай самакрытыкі.

* * *

Сувязь вытворчых ячэек КП(б)Б, заўкомаў і фабзаўкомаў са сваімі рабочымі, якія знаходзяцца на працы ў вёсцы, нельга невыстарчальна. Партыйныя прафсаюзныя арганізацыі некаторых прадпрыемстваў кажуць ня ведаюць, дзе і на якой працы знаходзяцца іх рабочыя. Вылучылі, накіравалі і забыліся. Многія «25-тысячнікі» скарджацца, што на іх шматлікія лісты няма адказаў з прадпрыемстваў. Гэты буйнейшы недахоп у сыстэме кіраўніцтва «25-тысячнікамі» з боку фабрычна-заводзкіх арганізацый павінен быць ліквідаваны. Тыя складаныя ўмовы, у якіх знаходзяцца і працуюць «25-тысячнікі», вымагаюць ад партыйных і рабочых арганізацый і прадпрыемстваў павялічэньня ўвагі, узмацненьня кіраўніцтва і дапамогі. Трэба наладзіць узаемную пісьмовую сувязь, ставіць на абмеркаваньне адпаведных органаў лісты «25-тысячнікаў», нарыдычна заслухоўваць іх інфармацыі на пасяджэньнях бюро партколектываў і фабзаўкомаў, даваць далейшы напрамак у рабоце, наладзіць узаемны абмен насьценгазэтамі і г. д.

Труднасьці вясковай работы, якая праходзіць ва ўмовах жорсткага клясавага змаганьня, адсутнасьць часамі патрэбнай увагі і дапамогі з боку мясцовых арганізацый, невыстарчальныя умовы бытавога парадку,—не паслабляюць і не паслабяць пралетарскай устойлівасьці і творчай энэргіі рабочых «25-тысячнікаў».

Рабочы тав. **Новікаў,** які працуе ў калгасе «Новы лад», Боркавіцкага раёну, піша нам:

— Баявыя задачы партыі па сацыялістычным будаўніцтве захапілі мяне, я ўвесь адданы практычнай работе па выкананьні гэтых задач. Ніякія труднасьці мяне не пахіснуць.

МАЛАДАЯЎ, рабочы з-ду «Чырвонае Сормава», зараз старшыня калгасу «Іскра», Чэрыкаўскага раёну

Такой бадзёрасьцю і ўпэўненасьцю натхнёны рабочыя «25-тысячнікі», яны поўнасьцю апраўдалі давер'е партыі і рабочае клясы бальшавіцкай работай на сацыялістычнай перабудове вёскі, бязьлітасным змаганьнем супроць клясавага ворага—кулака і яго агентуры ў партыі—правых і «левых» апартуністых.

Я. ІВАШЫН.

Пралетарыят Бэрліна бурна вітае стварэньне баявога прафсаюзу мэталістых

БЭРЛІН, 5. Учора вечарам у Бэрліне адбылася далегацыя канфэрэнцыя рабочых мэтал-прамысловасьці, якая канчаткова аформіла стварэньне рэвалюцыйнага прафсаюзу мэталістых Бэрліна. У канфэрэнцыі прымала ўдзел **1.600 дэлегатаў** з прадпрыемстваў, ад арганізацый рэфармісцкага прафсаюзу мэталістых і ад служачых. Дзьве вялізарныя залі, у якіх адбывалася канфэрэнцыя, былі перапоўнены рабочымі, работніцамі, моладзьдзю і вучнямі, **бурна вітаўшымі стварэньне адзінага баявога прафсаюзу бэрлінскіх мэталістых.** Выключна баявы настрой рабочых сьведчыў аб тым, што яны не адчуваюць сябе пераможанымі, ня гледячы на адрадніцтва рэфармістых.

З дакладам аб значэньні забастоўкі берлінскіх мэталістых выступіў старшыня бэрлінскага камітэту нямецкай кампартыі **т. Кунц.** Ён падкрэсьліў, што гэта забастоўка замацавала правільнасьць рэвалюцыйнай забастовачнай тактыкі кампартыі і паказала поўнае банкрутства бюракратаў з рэфармісцкага прафсаюзу мэталістых. З прывітаньнем ад Прафінтэрну выступіў **т. Нідэрнірхнэр.**

У спрачках прынялі ўдзел прадстаўнікі шматлікіх прадпрыемстваў, прадстаўнікі беспрацоўных, моладзі, рабочых і служачых. Тав. **Ульбрыхт** перадаў канфэрэнцыі баявое прывітаньне ад ЦК нямецкай партыі.

З бурным ухваленьнем канфэрэнцыя прыняла рэзалюцыі аб уроках забастоўкі берлінскіх мэталістых і аб задачах рэвалюцыйнага саюзу мэталістых. У рэзалюцыі ганорыцца, што барацьба супроць спробы зьніжэньня зарплаты працягваецца. Рэзалюцыя заклікае сабраць усе сілы для арганізацыі рэвалюцыйнага супраціўленьня наступленьню прадпрыемцаў.

Пасьля прыняцьця рэзалюцыі канфэрэнцыя абрала кіруючы орган рэвалюцыйнага прафсаюзу мэталістых Бэрліна. Абрана 60 рабочых, работніц і прадстаўнікоў моладзі.

У сувязі са стварэньнем чырвонага прафсаюзу мэталістых, **«Ротэ Фанэ»** піша: «мэталістыя Бэрліна стварылі арганізацыю, якая пад кіраўніцтвам рэвалюцыйнай прафсаюзнай і нямецкай кампартыі пачне масавую барацьбу супроць дыктатуры ўраду Брунінга. Чырвоны саюз мэталістых Бэрліна падымае сьцяг непрымірымай клясавай барацьбы супроць прыгнечаньня і клясавага здрадніцтва». (ТАСС).

СССР—першая краіна, якая вырашыла праблему беспрацоўя

НЬЮ-ЕРК. Экспамічны эксперт Гарынтон Эмэрсон, які вярнуўся нядаўна з Савецкага Саюзу, у сваёй прамове у «Таварыстве прамысловых інжынэраў», заявіў, што **СССР зьяўляецца першай краінай, вырашыўшай праблему беспрацоўя** і адолеўшай прыстасаваць сваю прамысловасьць да сацыяльных патрэб мас. Эмэрсон заявіў, што праноў індустрыялізацыі адбываецца ў СССР з хуткасьцю, якая зьдзіўляе ўвесь сьвет. «Калі савецкі ўрад, — заявіў Эмэрсон, — вырашыць праблему стварэньня магутнай фабрычна-заводзкай прамысловасьці, ён зможа скарацыць рабочы дзень, ня зьніжаючы высокага заработку зарплаты». (ТАСС).

Канфэрэнцыя выбарчага камітэту Цэнтралеву пад аховай паліцыі

Як вядома, ануляваньне выбарчых сьпісаў рабоча-сялянскага адзінства адбылося пры чынным падтрыманьні прадстаўніку цэнтралеву. Абуранью пралетарыяту такою настановаю цэнтральнай выбарчай камісіі ня было границ. У Варшаве і інш. прамысловых цэнтрах Польшчы адбыліся шматлікія мітынгі пратэсту супроць такой самаволі фашысцкай улады. Асабліва пралетарыят абураны аддадзенай паводзінамі прадстаўніку цэнтралеву,—гэтым агентаў польскага фашызму. У Лодзі канфэрэнцыя выбарчага камітэту цэнтралеву адбывалася пад аховаю паліцыі, бо пралетарыят Лодзі ўвесь час атакаваў памашканьне канфэрэнцыі, каб распавіцца з лёкаямі польскага фашызму.

А о гадз. увечары лік дэманстрантаў настолькі павялічыўся, што паліцыя ня ў стане была з імі справіцца. У воины пасыпаўся град каменьняў. Злажаўшы супраціўленьне паліцыі, дэманстранты мінуліся ў залю, дзе адбывалася канфэрэнцыя, і разграмілі ўсю абстаноўку. Быў выкліканы новы атрад паліцыі, яко му з трудом удалося ўстанавіць парадак і ачысьціць залю. Некалькі чалавек арыштавана.

Працэс б. паслоў Беларускага Рабоча-сялянскага Клюбу

Ян падае манархічнае віленскае «Слова», 17 лістапада ў віленскім акруговым судзе пачнецца працэс былых паслоў Беларускага рабоча-сялянскага клюбу ВАЛОШЫНА КРЫЧЫКА, ГАЎРЫЛЮКА І ДВАРЧАНІНА. Усім ім прад'яўлена абвінавачаньне ў кіраўніцтве кібы камуністычным рухам у Зах. Беларусі і ў кантакце з Камінтэрнам.

Уся бязглуздзіца гэтага абвінавачаньня відаць ужо з аднаго толькі факту, што да гэтай справы прыцягваецца і былы пасол Валошын, які засуджаны на 6 год катаргі па справе Беларускай Грамады і ўжо тры гады, як знаходзіцца ў турме.

Мы ня раз ужо адзначалі, што польскі фашызм, каб стэрарызаваць працоўныя масы, і арабіць іх сваім паслушным гарматным мясам, кідае ў турмы лепшых прадстаўніноў гэтых мас бяз ніякай віны і доведу, і пасьля ўжо пачынае «здабываць» гэтыя довады ў засьценках дэфэмазыды, або шукаць іх шляхам правакацыі. Справа паслоў Беларускага рабоча-сялянскага клюбу—найлепшы довад гэтага.

Дэлегацыя БелАПП'у на пленуме савету міжнародных пралетарскіх пісьменьнікаў

6-га лістапада ў Харкаве адкрываецца пленум савету міжнародных пралетарскіх пісьменьнікаў. Ад БелАПП'у на пленум выехала дэлегацыя ў складзе А. СЯНКЕВІЧА, ЛІМАНОЎСКАГА, П. ГАЛВАЧА І БЭНДЭ.

Разгул белага тэрору У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

ЗНОУ МАСАВЫЯ АРЫШТЫ У ВІЛЬНІ

У сувязі з надыходзячымі выбарамі ў польскі сойм, увесь апарат дэфэнзывы, паліцыі і сышчыкаў паставлен на ногі. Няма таго дня, каб у фашысцкай Польшчы ў тым ці іншым павеце, або горадзе не адбываліся масавыя вобыскі і арышты сярод рэвалюцыйных рабочых і працоўнага сялянства. Асабліва ва лютае прадвыбарчы фашысцкі тэрор У ЗАХ. БЕЛАРУСІ І ЗАХ. УКРАІНЕ. Як падае польская буржуазная прэса, 3-га лістапада ў Вільні праведзены зноў масавыя арышты і вобыскі сярод рэвалюцыйных рабочых. Паводле вестак паліцыі ў часе вобыску нібы знойдзена шмат цыркуляраў, адозваў і брашур, нібы інструкцыя ЦК КПЗБ, а таксама выкрыта нібы нелегальная камуністычная друкарня. У друкарні ў часе набору камуністычных адозваў арыштавана двое рабочых. Усяго-ж за ноч У ВІЛЬНІ АРЫШТАВАНА НЕКАЛЬКІ ДЗЕСЯТКАЎ ЧАЛАВЕК. Усе арыштаваныя пасаджаны ў Лукіскую турму.

КАТАРЖНЫ ПРЫСУД НАД РЭВАЛЮЦЫЙНЫМІ РАБОЧЫМІ

У Любліньскім акруговым судзе 4 дні цягнуўся працэс члена ЦК—лідзіцы па абвінавачаньні ў камуністычнай дзейнасьці. 1-га лістапада вынесен прыгавор, на падставе якога падсудныя Шыфірштэйн, Дубчан і Люксембург засуджаны да 8 год катаргі кожны, Вайтовіч—на 6 год катаргі. Славінскі, Пепінскі, Зьбічан, Фалён, Баўмгартэн, Гольдбаум і Гольц—на 4 гады катаргі кожны. Дзэрба, Вантробна, Урфірэр і Валера—да 2 год катаргі кожны.

Адначасова ў Ковелі (на Валыні) адбыўся вялікі працэс супроць 64 рэвалюцыйных рабочых і сялян Заходняй Украіны. Частка падсудных абвінавачвалася ў прыналежнасьці да КПЗУ, а частка да УВА. Працэс працягваўся два тыдні. Падсудных бранілі адвакаты Ліндау і Заяц з Львова і Розенбліт з Перамышля.

У першых чыслах лістапада быў агалошаны прыгавор, на падставе якога **4 чалав. засуджаны на 8 год катаргі кожны, адзін—на 6 год катаргі, 9 чал.—на 5 год катаргі, 27—на 4 гады катаргі кожны.** Рашта апраўданы.

Па тэхнічных прычынах увесь матар'ял, прысьвечаны луону Асінбулу, ня мог быць зьмешчаным у Кастрычніцкім нумару. Ён будзе скарыстаны ў бліжэйшых нумарох.

9-га лістапада—працяг сходу парткалектыву рэдакцыі газэт

У нядзелю, 9-га лістапада, а 6-ай гадзіне ўвечары ў памяшканьні вялікай залі пасяджэньняў ЦК КП(б)Б (вуліца Карла Маркса) адбудзецца працяг агульнага сходу калектыву КП(б)Б рэдакцыі газэт і друкарні «Зьвязда». Яўка ўсіх партыйцаў і камсамольцаў, якія працуюць у рэдакцыях газэт і ў друкарні, абавязкова ў парадку партыйнай і камсамольнай дысцыпліны. Рэгістрацыя пачнецца за 20 хвілін да сходу. Уваход па партыйных і камсамольскіх білетах.

БЮРО КАЛЕКТЫВУ КП(б)Б.
БЮРО КАЛЕКТЫВУ ЛКСМБ.

НОВЫ ПАРАДАК РАЗЬМЕРКАВАНЬНЯ ДЭФІЦЫТНЫХ ТАВАРАЎ

У гутарцы з нашым супрацоўнікам, намесьнік старшыні Белкаапсаюзу тав. **Кондраль** паведаміў наступнае:

— Існуючая дагэтуль сыстэма разьмеркаваньня тавараў стварала вялікія затрудненьні ў рэалізацыі тавараў фондаў і мабілізацыі сродкаў насельніцтва. Расло затаварваньне, замарудзваўся тавараваў абарот.

Шматлікія бранірованьні тавараў фонды ў нізоўцы, створаныя для прэміяваньня розніцы віду заготовак, рэалізоўваліся вельмі павольна, заўсёды заставаўся вялікі запас бранірованых, але не рэалізаваных тавараў.

Талённая сыстэма ў гарадох у сваю чаргу затрымлівала рэалізацыю. Талёны ляжалі тыднямі ў кішэнях найпчыкаў. Тавары, прызначаныя на задавальненьне спажыўцоў, атрымаўшы талёны, месцамі ляжалі бяз руху на паліцах крам. Вялікія тавараныя масы былі кінуты на заготоўкі, заставаліся абмежаваныя фонды для задавальненьня патраб рабочых, беднякоў і калгаснікаў.

На сёньнішні дзень у нізавой сетцы пляжыць не рэалізаваных тавараў на суму 17 мільёнаў руб.

Зараз, у мэтах хутчэйшай рэалізацыі тавараў і мабілізацыі сродкаў, сыстэма выдачы тавараў рэарганізуецца.

Перш-на-перш ліквідуецца бранірованьне тавараных фондаў для прэміяваньня заготовкаў збежжа, сыроу, малака і г. д. Застаюцца мэтавыя фонды для дадатковага забесьпячэньня рабочых лесазагатовак, сплаву, мясазагатовак, дарэтрансу і рыбалоўных раёнаў.

Усе запасы прамтавараў пашыны быць безадкладна пущчаны ў продаж працоўнаму насельніцтву в тым, каб гэты продаж стымуляваў поўнае выкананьне плянаў усіх відаў заготовак і максымальную мабілізацыю сродкаў.

Большая колькасьць прамтавараў будзе паслана ў тыя раёны і населеныя пункты, якія ідуць наперадзе ў выкананьні заготовак.

Да 30 проц. фондаў прыкуцца пусьліць на лепшае задавальненьне рабочых саўгасаў, машына-трактарных станцый, беднякоў, батракоў, калгаснікаў і настаўнікаў.

Некуратным здатчыкам збожжа і інш. прадуктаў продаж тавараў павінен быць абавязкова спарочаны.

Ліквідуецца талённая сыстэма выдачы дэфіцытных тавараў у гарадох. Застаюцца талёны толькі на абутак, гарнітуры і паліто. Маса тавараў, якая сабралася на складах і базах, будзе кінута ў закрытыя разьмеркавальнікі для рабочых, і ў агульныя магазыны, якія таксама будуць выдаваць тавары ў першую чаргу рабочым.

Тэрмін дзейнасьці талёнаў на атрыманьне абутку, гарнітураў і паліто устанаўляецца максымальна ў 10 дзён. Пасьля гэтага тэрміну, талён анулюецца, і тавар паступае у агульны продаж на палкавы кніжках.

Зараз у многіх раёнах ёсьць тавары не надыходзячых асартыментаў, якія рэалізуюцца вельмі павольна. Гэтыя тавары будуць перакінуты ў іншыя раёны, дзе на іх ёсьць попыт.

Новы парадак разьмеркаваньня тавараў уводзіцца ў гарадох з 4 лістапада, а на вёсцы з 5.

Праведзены інструкцыйныя нарады старшынь ЦРК і распаяжэньтаварыствам у мэтах хутчэйшага ажыцьцяўленьня дырэктыў.

У заключэньне, тав. Кондраль падкрэсьліў, што новы парадак выдачы тавараў патрабуе **узмацненьня рабочага кантролю над работай кааперацыі.** Трэба прыпягнаць да суровай адказнасьці ўсіх тых пайпчыкаў, хто будзе разбазіваць атрыманыя тавары і перапрадаваць іх, а таксама прадаўцоў, якія будуць злоўжываць новым парадкам.

Рабочая грамадзкасьць павінна пільна сачыць за тым, каб ня было злоўжываньняў новым парадкам водпуску тавараў.

Плавіцца жыцьцё

а сэнсу пажнуся сутулены працай стары рабочы. Ірвае сьвятло сьлепіла яго вочы і яны, як зоры ў асеньнія хмары, хаваліся ў густа зарослым твары. Упаўпена і спакойна пачаў прамову стары рабочы.

— Таварышы ўдарнікі! На вашыя шырокім шляху ляжаць вялікія труднасьці. І шмат іх — гэтых труднасьцяй. Яны бынтаюцца пад нагамі, мулюць цлечы. Мы сьвядома, абдумана не пайшлі па ўезджаных дарогах. Мы парашылі ісьці проста, воль так (стары рабочы расьсек рукою паветра на роўныя часткі), вось туды (ён паказаў на чырвонае палотнішча абшуцу), мы самі пракладзем простую і верную дарогу.

... Так пачаў прамову стары рабочы, барадаты энтузіясты, найленны ўдарнік. Так пачаў выступленьне на гомельскім зьлёце ўдарнікаў металісты **Брусаваньнін Сіман** — старэйшы рабочы заводу «Пралетары».

Інакш можна?

На вытворчай нарадзе разглядалі скаргі, Магнітагорск, Днепрэльстан, Асінбуд пісалі вялікія лісты аб растворамяшалках. Аб тых самых «буржуйскіх» мяшалках, за якія мы плацілі золатам і за якія ў 1928 годзе перасталі плаціць. З 1928 году растворамяшалкі нямецкага тыпу пачалі вырабляць на заводзе «Пралетары», у БССР, у Гомелі. Нямецкая растворамяшалка мела незабытыя «пралетардамі» ланцуг Галя. Той самы ланцуг, які быў падзеты на зубчастыя шасьцярэнкі і, прыводзячы у рух барабан, хутка расьцягваўся, не падаў на зубцы, даваў перабоі ў машыне.

Ланцуг Галя рабіўся лепшымі рабочымі з лепшай сталі. І гэта не выратоўвала завод. Магнітагорск, Днепрэльстан, Асінбуд скарджаліся на ланцуг Галя і пыталі — **ці нельга інакш?**

Ці нельга інакш? — думала вытворчая нарада заводу. Інакш можна? — пытаўся ў сябе камсамолец Рабіновіч.

... Разьдзіраючым голасам просіцца сталь. Прыдушана скрыгоча чыгун на вострых зубах машыны. Стружка жалеза пакідуманы тавары варыцьце. Шырокалічная канцэлярчыкі — Марозі і Нікіцін — дружным высокім узмахам цяжкага молата «шыюць» каты. Завод патануў у песнях мэталю.

Камсамолец Рабіновіч ужо да адказу закручу шрубу і усё яшчэ нолягаў на ключ, хацеў закруціць яшчэ тузін, яшчэ лепш. Яго зараз мучыць—**інакш можна?** Ён бесьсьвядома сьцісае ў руках мяжаную дэталь растворамяшалкі і са злосьцю падзарова гледзіць на ланцуг Галя. Рабіновіч мала гаворыць, ён працуе моўчкі. Ён ужо вынучыў усе дэталі растворамяшалкі, іх узаемадзейнасьць, ён у выхадныя дні і перапынкі на сьнеданьне ня раз сядаў каля машыны, пакручваў руль, складаў барабан, прыкідаў нешта ў галаве.

Гэтага вечару Рабіновіч ня выходзіў са сваёй кветэрмы і да прыцішнай ныбокай ночы выводзіў на паперы яму зразумелыя кружочкі, крывыя і простыя лініі. Позаўтра, пасьля сьнеданьня Додзік Рабіновіч ня сьмела, а ўнутранай трывогай, падышоў да сваіх лепшых таварышоў на брыгадзе — Мішкі Касьнога, Абрашы Кальвана, Арончыка, Мазашэнкі і другіх — і адкрыў ім свой «сакрэт».

Таварышы на ўлічыві шалёнай працы і вялікіх мук вынаходкі і сарамлівасьці таго, хто прынёс з імі нарадзіцца, ім адкрыцца.

— Замяніў пыла лазою! — ухмыльнуўся адзін.

— Чудак ты, Додзік, хіба-ж гладзі рэмешы нас лепш за сталёвы ланцуг?

Гэтага было даволі. Рабіновіч сарамліва схаваў чарцёж у кішэні рабочай блюзы, моўчкі ўткнуўся вачыма ў зямлю і разьбітым альшоў у бок. Яму самому здалося зусім сьмешным тое, ва што ён так моцна верыў яшчэ хвіліну таму назад, і ён зусім не зважаў на таварышоў.

Додзік Рабіновіч працуе ў брыгадзе па вёсмы растворамяшалак. Гэта найлепшая брыгада на заводзе, а яе брыгадзіры — камуністы і камсамольцы—лепшыя ўдарнікі. Гэта брыгада моцна зьнітавана ў адно цэлае, маналітнае, непадзельнае. У іх адна мэта—**ісьці наперадзе сацыялістычнага спаборніцтва і перавыканаць свой сустрэчны.**

У брыгадзе любілі Рабіновіча і боль яго — біў болем усе брыгады. Уся брыгада стала чула адносіцца да свайго таварыша-вынаходніка.

Расчараваны першай нядачай Рабіновіч ня зьбіраўся далей прыцягваць сваю работу над удасканаленьнем мяшалкі. Але ўрабіць гэта прымусіў калектыў — свая ўдарная брыгада, брыгада камуністых і камсамольцаў, камуністычнага цэху. Гэта яна паказала яму, накіроўвала яго творчыя думкі, работу на правільны шлях, правяла яго першыя крокі, падтрымлівала ў хісткіх мясцох. І Рабіновіч, падтрыманы брыгадай, сканструяваў сваю растворамяшалку. Ён замяніў апрацёўшы пасьцярэнкі, зубчастымі шасьцярэнкамі Рабіновіча.

Усе бачылі, што вынаходка Рабіновіча зусім зьмяніла растворамяшалку, робіць яе моцнай і высока прадукцыйнай машынай. Трэба хутчэй гэтую вынаходку ажыцьцявіць. Трэба зрабіць заміну дзіркі на заводзе, праз якія валяцца тысячы рублёў грошай і сотні тон мэталю.

Рабіновіч і яго брыгада білі бяльмем на рады свайму калектыўнаму вынаходзтву і былі перакананы ў яго хуткім ажыцьцяўленьні. Але антуяістыя работы памыліліся. На шляху стала многа барэраў. Першы такі барэр—заводзкіраўніцтва «Пралетарыя». Другі барэр—цэхавы вытворчы камітэт.

Заводзкіраўніцтва і цэхкамітэт сьвятлі з адну бюракратычную дудку: гэта та ня наша справа! Нам Строймеханізацыя даў зараз чарцёжы, вось па іх мы і робім мяшыны! Нам няма калі займацца ўдасканаленьнем чужых машын.

Рабіновіч схаваў свае чарцёжы, прыходзіў акуратна на завод, на званку станавіўся на работу і з агідай адлядаў на забраныя машыны ланцугі Галя.

Вясною прыехаў з Масквы на завод «Пралетары» прадстаўнік Строймеханізацыі Палубоцька. Рабіновіч ня думаў да яго зьвярнуцца, але брыгада прымусіла:

— Пайдзі Додзік, пайдзі! Абавязкова пайдзі і пагаварыі з маскоўскім таварышом.

Палубоцька чарцёжы Рабіновіча у Маскву і праз некаторы час Строймеханізацыя прысылае прапанову заводу выраблядь новыя растворамяшалкі, па канструкцыі Рабіновіча, але аўтарам новай машыны ўжо лічыцца не металісты Рабіновіч, а... аформысты Палубоцька.

Додзік Рабіновіч паехаў у Маскву, працёў на насьледаньне ў ВСНГ і з дакамагою сваіх таварышоў-брыгадзіраў вынуў афармысты Палубоцькі.

Сёньня «Пралетары» выпускае новыя месяц 100 растворамяшалак канструкцыі свайго маладога рабочага. Сёньня завод эканоміць на мяшалках сто тысяч рублёў і сотні тон мэталю. Сёньня Додзік Рабіновіч вучыцца ў Ленінградзкім тэхнічным унівэрсытэце, каб заўтра даваць свае крыпкі сотні новых вынаходак і прапаноў.

Можна інакш!

Два гады таму назад, у лістае 1928 г. завод «Пралетары» выпусьціў першую савецкую растворамяшалку. Тады была мяшына—вялізная, плэгрбная, непавартлівая і кепска працавала, мяшына нямецкага тыпу. І на яе назьней скарджаліся Магнітагорск, Днепрэльстаны, Асінбуды.

Цяпер «Пралетары» выпускае растворамяшалкі не нямецкага тыпу, а свайго **пралетарскага**—меншага разьмеру, значка спрэчнаную, прытомную, ва многа раз лацнейшую, ва многа раз з большаю прадукцыйнасьцю работы.

За Рабіновічам пайшлі токар Конанаў, сьлесар Зак, механік Мэтэр, майстар канцэлярага цаху Кауфман, пыракаплеры канцэлярчыкі

Дэкада надзвычайных дзеяньняў

7-8 лістапада—дні ўдарнага суботніка на сплаве

Дэкада надзвычайных дзеяньняў на сплаве, якая абвешчана з 1-га лістапада, ускладае на ўсе арганізацыі, усю грамадзкасьць баявое заданьне—скончыць сплаў да 10 лістапада.

Задача забесьпячэньня капітальнага будаўніцтва драўнінай, вельмі абмежаваны тэрмін, які застаўся да пёдаставу, патрабуюць сапраўды бальшавіцкіх тэмпаў, ударных, гэрачных мер, каб з посьпехам скончыць сплаў.

Тэлеграма старшыні СНК БССР т. ГАЛАДЗЕДА выразна падкрэсьлівае, што невыкананьне баявога заданьня па сплаве зьяўляецца дзяржаўным злачынствам.

Дэкада надзвычайных дзеяньняў дыктуецца ўсёй абстаноўкай, якая склалася на сплаве.

Да 10 лістапада засталося пусьціць у сплаў 10.000 куб. мэтраў будаўнічых матар'ялаў і 24.000 куб. мэтраў дроў. Звыш 460.000 куб. мэтраў дроў і матар'ялаў знаходзіцца па дарозе да прыстаняй і лесазаводаў Нова-Барысава, Бабруйску, Гомелю, Рэчыцы і Мазыра.

Дровы, зданыя Хойніцкім і Мазырскім лесапрамгасамі Кіеўскаму цэрабкопу ў колькасьці 56.000 куб. мэтраў, знаходзяцца пад рэальнай пагрозай зімоўкі на прыстанях БССР. Дровы могуць ня трапіць да рабочага спажыўца Украіны.

Апрача таго для Мазыра трэба перавезьці па Прыпяці 12.000 куб. мэтраў і для Гомеля 12.000 куб. мэтраў. Як мы бачым, становішча патрабуе вельмі напружаных тэмпаў.

Дняпроўскае дзяржпараходзтва, ня гледзячы на рад тэлеграм аб павялічэньні танажу для мясцовых перавозак і для перавозак на Украіну, упарта зрывае падачу барж пад дровы. З месц паступаюць весткі, што баржы не падаюцца. На р. Сож і Прыпяці працуе 11 барж, якія далёка не забясьпечваюць дастаўкі дроў.

Урадавыя органы павінны дабіцца, каб Дняпроўскае рэчнае параходзтва павярнулася тварам да сплаву і дапамагло БССР выканаць праграму.

Вялікія абавязкі ўскладаюцца на каапэрацыйныя арганізацыі. Белкаапсаюз даў тэлеграму ўсім спажывецкім таварыствам, каб у часе дэкады рабочыя, занятыя на лесасплаве, былі забясьпечаны поўнасьцю прадуктамі і прамтаварамі за лік мясцовых фондаў. Наркамгандлю прапанаваў усім райгандлям ва ўдарным парадку прасачыць за рэалізацыяй дырэктыў наконт харчаваньня і забесьпячэньня прадуктамі рабочых сплаву.

Наркампрацы БССР даў распараджэньне, каб работы на сплаве ня спыняліся 7 і 8 лістапада. Дні сьвят зьяўляюцца ўдарным суботнікам на сплаве.

Агульным напружаньнем усіх сіл мы павінны дабіцца, каб да 10 лістапада лесазагатоўчыя арганізацыі рапартавалі партыі і ўраду: ПРАГРАМА СПЛАВУ 1930 Г. ВЫКАНАНА.

КАСТРЫЧНІЦКІ РК КП(б)Б разам з рэдкалегіямі газэт «ЗЬВЯЗДА» і «РАБОЧИЙ» склікае 11-га лістапада ў 6 гадз. увеч. у памяшканьні клюбу мэталістых (Унівэрсытэцкая, 12) нараду рэдкалегій шматтыражак, насьценгазэт, рабкораў з наступным парадкам дня:

1) Задачы рэдкалегій: шматтыражак, насьценгазэт і рабкораў у выкананьні грамфінпляну ўдарнага кварталу і падрыхтоўка да прамфінпляну на 1931 год (дакл. аднакн. рэдактар газ. «Зьвязда» тав. БУДЗІНСКІ).

2) Даклады сакратароў партыкалектываў: чыгункі, «Энэргія», «Бальшавік», штотачнай ф-кі і абутковай ф-кі аб выкананьні пастановы бюро РК па кіраўніцтве рэдкалегіямі і рабкораўскім рухам. 3) Даклады аб ходзе падпіскі на газэты.

На нараду павінны зьявіцца сакратары ячэек, старшыні заўкомаў, рэдкалегіі шматтыражак і насьценгазэт, рабкоры, сэкцыі друку ячэек, упаўнаважаныя па падпісцы на газэты.

КАСТРЫЧНІЦКІ РК КП(б)Б разам з рэдкалегіямі газэт «ЗЬВЯЗДА» і «РАБОЧИЙ» склікае 11-га лістапада ў 6 гадз. увеч. у памяшканьні клюбу мэталістых (Унівэрсытэцкая, 12) нараду рэдкалегій шматтыражак, насьценгазэт, рабкораў з наступным парадкам дня:

1) Задачы рэдкалегій: шматтыражак, насьценгазэт і рабкораў у выкананьні грамфінпляну ўдарнага кварталу і падрыхтоўка да прамфінпляну на 1931 год (дакл. аднакн. рэдактар газ. «Зьвязда» тав. БУДЗІНСКІ).

2) Даклады сакратароў партыкалектываў: чыгункі, «Энэргія», «Бальшавік», штотачнай ф-кі і абутковай ф-кі аб выкананьні пастановы бюро РК па кіраўніцтве рэдкалегіямі і рабкораўскім рухам. 3) Даклады аб ходзе падпіскі на газэты.

На нараду павінны зьявіцца сакратары ячэек, старшыні заўкомаў, рэдкалегіі шматтыражак і насьценгазэт, рабкоры, сэкцыі друку ячэек, упаўнаважаныя па падпісцы на газэты.

Датэрміновы выпуск эканамістых—падарунак да 13-цігодзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі

Факультэт народнай гаспадаркі дае ўжо 8-ці выпуск эканамістых прамысловасьці, каапэрацыі, фінансавым і пляцуючым органам. Выпуск 45 эканамістых у нашых умовах зьяўляецца падарункам да Кастрычніцкіх сьвят яшчэ і таму, што мы зможам на месца шкодніцкіх элемэнтаў, зрываючых пабудову нашай сацыялістычнай гаспадаркі, паставіць нашых сапраўдных чырвоных спэцыялістых як спэцыяльна падрыхтаваных, так і марксыцка-ленінска ўзброеных.

Выпуск мае вялікае значэньне і таму, што выпускнікі, за выключэньнем 10 чал., зьяўляюцца плянавікамі—эканамістымі ў той час, калі роля пляну на падставе дырэктыў XVI партзьезду займае такое месца, аб якім яшчэ многія з малавераў, ныцікаў і двурушнікаў партыі ня марылі сабе.

Таму задачай нашых чырвоных спэцыялістых на прадпрыемствах павінна зьяўляцца наступнае: уключыць сябе ў магутны патоп сацыялістычнага спаборніцтва; на падставе атрыманых ведаў па спэцыяльных прадметах і марксыцка-ленінскага ўзброеньня стаць у першых радох арганізатараў прадпрыемства на плянавых сацыялістычных пачатках. Практычнай работай і падмацаваньнем эканамічнымі выкладкамі аб нашых дасягненьнях паказаць малаверам, ныцікам і двурушнікам на тыя памылкі і тую шкодную контррэвалюцыйную работу, якую многія з іх імкнуцца праводзіць, а некаторыя праводзяць.

Увесь факультэт у дзень сьвята 13-цігодзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі, студэнцтва, навуковыя работнікі навіны правесьці агляд сваіх сіл з тым, каб узмацніць змаганьне за кадры чырвоных спэцыялістых.

Пад кіраўніцтвам партыі Леніна, узброеныя марксызмам і ленінізмам, шчыльнымі радамі прыдзем да новых перамог на фронце змаганьня за кадры чырвоных спэцыялістых.

Дакан наргасу—ГУРЛО.

Новы этап культурнай рэвалюцыі

Сёньня пэдфак дае краіне 150 чырвоных настаўнікаў

Сёньня ў дзень найвялікшага пралетарскага сьвята—XIII гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі—БДУ выпускае 150 чырвоных настаўнікаў, якія з посьпехам скончылі фіз.-тэхнічнае і прыродазнаўчае аддзяленьні. За ўвесь 1930 акадэмічны год пэдфак даў школам БССР 500 настаўнікаў, Гэта лічба зьяўляецца для пэдфаку на працягу яго існаваньня рэкордная па колькасьці выпускнікаў. У сэнсе якасьці выпускнікі 1930 г. стаяць значна вышэй папярэдніх выпускаў, як па сацыяльным сваім складзе, так і па партыйна-камсамольскім, а таксама і па марксыцка-ленінскай іх падрыхтоўцы.

Таварышы выпускнікі! гігантскі размах сацыялістычнага будаўніцтва, пасьпяховы рост індустрыялізацыі савецкай краіны, сацыялістычная рэканструкцыя вёскі, культурная рэвалюцыя, якія праходзяць пры абвастрэньні клясавай барацьбы ў краіне (кэпман, кулак, шкодніцтва, контр-рэвалюцыйныя арганізацыі)—усё гэта патрабуе ад вас бальшавіцкай загартаванасьці, ідэалёгічнай вытрыманасьці і адданасьці справе пралетарскай рэвалюцыі ва ўсёй вашай надыходзячай вялікай рабоце.

Марксава-ленінская палітэхнічная школа дасьць нашай савецкай краіне новыя мільённыя кадры для сацыялістычнай будоўлі ва ўсіх галінах.

На вашу долю, т. т. выпускнікі, выпала стаць актыўнымі перадавымі ўдзельнікамі будаўніцтва палітэхнічнай школы.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі вы з гэтай адказнай гістарычнай задачай справіцеся.

Кіраўніцтва БДУ ўпэўнена, што вы на ўсіх пазыцыях культурнага сацыялістычнага фронту будзеце ідэалёгічна вытрыманымі змагарамі.

Шчыра жадаю выпускніком добрых посьпехаў у надыходзячай працы па палітэхнізацыі школы.

Няхай жыве Камуністычная партыя—арганізатар і кіраўнік пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва!

Рэктар БДУ Я. КАРАНЕЎСКІ.

— Дом Асьветы 6 лістапада—урачысты вечар, прысьвечаны сьвяткаваньню XIII гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Уваход па разданых білетах. Пачатак вечара роўна ў 7 з пал. гадзін.

— Дэканат факультэту савбудаўніцтва і права паведамляе, што 6 лістапада заняткаў на вячэрн. ф-це сав. буд. і права ня будзе.

Паведамленьні

— Парт. тройка Фрунзаўскай РКК КП(б)Б (вул. Энгельса, 28) выклікае на 9 лістапада ў 6 гадз. увеч. наступных т. т.: Шафронак, А. Н., Субачоў, Ф. В., Розьнікаў, Л. С. (яч. Камвуаў), Паляшчук, Цярашка і Коніка (яч. парсувязі). Марошак, М. І., Розанаў, А. Ф., Давідаў, Э. Л. (ф-ка «Кастрычнік»), Васэрман (яч. Белдзяржбуду), Пяцкоў, М. Я. (яч. зав. «Камунар»), Шварц (КСУ), Пэўзнэр (яч. друк. БДВ) для ўдзелу пры разглядзе іх справаў. Таксама выклікаюцца сакратары парт'ячэек, дзе гэтыя т. т. лічацца на вучоце.

— Кастрычніцкі РК КП(б)Б склікае 10 лістапада ў 6 гадз. увеч. у клюбе Леніна (ст. Менск пас.) раённую канфэрэнцыю таварыства салдэйнасьці калектывізацыі сельскай гаспадаркі. У парадку дня: 1) Вынікі працы РТКСГ, 2) Выбары райсавету, 3) Выбары рэвізкамісіі. Модус прадстаўніцтва—1 дэлегат ад 25 членаў. Яўка дэлегатаў абавязкова і без спазьненьня. Мандаты атрымаць у РК 9 і 10 лістапада.

— БДУ. Для ўдзелу ў агульнай дэманстрацыі 7-XI—студэнты ўсіх факультэтаў, навуковыя працаўнікі і служачыя БДУ зьбіраюцца 7 лістапада ў 7 гадзін раніцы на Савецкай вул. супроць галоўнага корпусу.

— Наргас. Збор студэнтаў і навуковых працаўнікоў на дэманстрацыю 7 лістапада ў 9 гадзін раніцы каля прафкому.

— Камвуз Беларусі імя Леніна паведамляе, што заняткі па ўсіх аддзяленьнях і курсах, уключаючы курсы актыву КСМ (апрача нарасьветы) пачнуцца 1-га сьнежня.

— Дом Санітарнай Асьветы 6 лістапада будзе адчынен з 12 да 3 з пал. гадз. дня.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

7-га лістапада, а 8 гадз. раніцы, у памяшканьні 2-ой ШКОЛЫ (супроць пошты)

ЗБОР

1-га і 2-га АВІЯХІМАТРАДАЎ ФРУНЗАЎСКАГА РАЙСАВЕТУ РАЗАМ З РЭЗЭРВАМ І КУРСАНТАМІ.

Яўка ў форме абавязкова.

РАЙСАВЕТ.

З сёнешнім нумарам дасылаецца дармовы **Ілюстраваны дадатак да „ЗЬВЯЗДЫ“**, прысьвечаны XIII гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі.

НА 12 ЛІСТАПАДА, а 6 гадз. увеч.

склікаецца

ЧАРГОВЫ ПЛЕНУМ ЦСПСБ

З НАСТУПНЫМ ПАРАДКАМ ДНЯ:

1) Чарговыя задачы прафсаюзаў у сувязі з ліквідацыяй акруг (т. Рыжоў).
2) Вынікі праверкі кадрагавароў і перазаключэньне іх (т. Каменштэйн).
3) Вынікі работы прамысловасьці за 1929-30 год і кантрольныя лічбы на 1931 год (т. Грысевіч).

Пленум адбудзецца ў залі пасяджэньняў ЦСПСБ.

ЦСПСБ.

На 9-га лістапада, а 6 гадз. увеч., у памяшк. клюбу ДРУКАРОЎ

склікаецца

ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ РАБОТНІКАЎ ДРУКУ.

Парадак дня:

1. Справаздача Белбюро секцыі работнікаў друку.
2. Выбары далегатаў на Усесаюзны зьезд работнікаў друку.

Модус прадстаўніцтва на канфэрэнцыю: 1 дэлегат ад 15 членаў секцыі.

Адк. сакратар Белбюро—ЛЯВОНЕНКА.

ЗАУКОМ ЗАВОДУ „КАМУНАР“

запрашае ўсіх рабочых-вылучэнцаў заводу „Камунар“

прыняць удзел у суботніку,

які АДБУДЗЕЦЦА 8 ЛІСТАПАДА, а 8 гадз. раніцы на заводзе.

КІРАЎНІЦТВА АШЧАДКАСАМІ БССР

ПАВЕДАМЛЯЕ:

ШТО, ЗГОДНА ПАСТАНОВЫ НКФ СССР з 1-га кастрычніка г. г.

ЗЬМЕНЕН ТАРЫФ

за хаваньне аблігацый Дзяржпазык,

зданых і здаваемых у ашчадкасы ІНДЫВІДУАЛЬНА.

Паводле новага тарыфу з 1-га Кастрычніка ашчадкасамі бярэцца па 10 кап. у год (няпоўны год лічыцца за поўны) за кожную раней зданую і здаваемую індывідуальна на хаваньне аблігацыю.

Кіно-тэатр „Культура“

Пістарычны фільм **1917 год.** Шыр праграмы: За 12.000

Пачатак удзень а 1 г., увеч. а 7 г.

КІНО „Пралетары“

АД 6 ЛІСТАПАДА Новы фільм вытворч. „Сібір-кіно“ **КАНЕЦ ЖУРАЎЛІХІ**

Пачатак 1-га сэансу а 6 гадз. увеч. Каса адкрыта гд 4 гадз. 30 м.

КІНО „Юны піянэр“

Сумесная пастаноўка „Саюзкіно“ і „Вэльтфільм“ **СЕНЬНЯ**

Пачатак а 6 гадз. Каса з 5 гадз.

КІНО „Спартак“

4-я заключная серыя **Стэнлей у нетрах Афрыкі**

Пачатак а 12 г. 30 м. Каса з 11 г. дня.

Выдатны бытавы фільм **СОРАК [41] ПЕРШЫ**

Трагедыя у 6 частках. ПАЧАТАК: 7 г., 9 г., 10 г. 45 м. КАСА—з 5 г. 30 м.

БЕЛАРУСКАЙ КАНТОРАЙ трэсту «СЬВІНАВОД»

АДКРЫТЫ

6-МЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ ВЭТФЭЛЬЧАРОЎ

пры вэтінстытуце ў г. Віцебску.

На курсы прымаюцца: а) вайсковыя вэтфэльчары, дэмабілізаваныя РСЧА, б) вэтфэльчары, якія ня маюць скончанай асьветы вэтфэльчара, в) падрыхтаваныя вэтсанітары.

Заявы пасылаць у прыймовую камісію пры вэтінстытуце ў г. Віцебску.

Пры заяве прыкладаюцца наступныя дакументы: а) аб асьвеце, б) аб стажы практычнай працы, в) рэкамэндацыя партыйнай, камсамольскай або прафсаюзнай арганізацыі, г) аб сац. пахаджэньні і непазбаўленьні выбарчых праў, д) даведка ад адміністрацыі, што вызваляецца ад працы.

Усе скончыўшыя курсы паступаюць на працу ў саўгасы «Сьвінавода».

Курсанты забясьпечваюцца агульным памяшканьнем і стыпэндыяй 65 руб. у месяц.

Камплектаваньне да 10 лістапада.

Беларуская кантора трэсту „СЬВІНАВОД“.

БЕЛАРУСКІ ХЭМІКА-ТЭХНАЛЁГІЧНЫ ІНСТЫТУТ

(г. Менск, Зямляробчы заво., д. № 4).

АБВЯШЧАЕ

ЗІМОВЫ НАБОР НА НАСТУПНЫЯ СПЭЦЫЯЛЬНАСЬЦІ ІНСТЫТУТУ:

скураную —40 чал.
тарфяную —20 „
брадэільную —20 „
харчавую („кондитэрскую“) —20 „
грубую кераміку—20 „

Тэрмін падачы заяў ад 25 кастрычніка па 20 лістапада. Пасьля 20 лістапада прыём заяў спыняецца.

Пачатак заняткаў—1 студзеня 1931 г. а з 10 сьнежня заліканьня ў лік студэнтаў праходзяць 20-дзённы ваенкорны збор.

Ацэньны даведнік з паказаньнем дакладных правіл прыёму ёсьць у продажы у магазынах Белдзяржвыдавецтва.

Пры інстытуце арганізавана бюро даведак, якое працуе штодзенна з 3—4 і 6—7 гадз. увеч.

Дырэктар інстытуту КУНІЦА.

ЛЯЧЭБНІЦА МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА КАМІТЭТУ УЗЕЛЕЖДАЛАГО

Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Саветаў

АДКРЫТА ад 9 г. ран. да 9 г. увеч.

Прыём хворых на ўсіх спэцыяльнасьцях:

па ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурна-венэрычных, страўніцкіх, нэрвовых.

ЭЛЕКТРА-СЬВЕТА-ЛЯЧЭНЬНЕ і КВАРЦ адкрыты з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.

РЭНТГЕН (здымкі, прасьвечаньні, лячэньне) адкрыт з 6 г. да 8 г. увеч.

ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. увеч. штодзенна

КАНСУЛЬТАЦЫЯ ПРАФЭСАРОЎ па ўсіх спэцыяльнасьцях па папярэдняй запісе.

Урачэбная дапамога на дому па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запіс с 9 г. раніцы да 9 г. увеч.

Прыём хворых на кожных ніжніх па мітэту. Для ўсіх іншых грамадзян за агульнадаступную дыфэрэнцыявную плату.

ЗОО-ВЫСТАУКА **ЗЬВЯРЫНЕЦ**

ДЗЯРЖЦЫРКУ Савецкая, 90, рог Ленінскай

адкрыта штодзенна з 8 г. ран. да 11 г. увеч.

ПРЫБЫЛІ НОВЫЯ ЗЬВЯРЫ:

лоў, леапард, гіена палосатая, гіена пляміотая, ваўкі, мядзьведзі, рысь, мураўеды, дзікабразы, барсукі, алень, вярбаюд, аплы, крамадзіл, 20 малп і шмат іншае зьвярыны.

Школам і экскурсіям—ільготная плата, скідка 40 проц.

АДМІНІСТРАЦЫЯ.

15 ЛІСТАПАДА, г. г. у гор. МЕНСКУ

склікаецца

ПАШЫРАНАЯ СЭСІЯ САВЕТУ КАЛГАСЦЭНТРУ БССР

з удзелам старшынь райкалгассаюзаў і райкалгассэкцый.

ПАРАДАК ДНЯ НАСТУПНЫ:

1. Вынікі і чарговыя задачы калгаснага будаўніцтва.
2. Плян веснавой пасеўнай кампаніі ў калгасах на 1931 год.
3. Аб чарговых задачах у галіне жывёлагадоўлі ў калгасах.
4. Пытаньні арганізацыі працы ў калгасах.
5. Задачы калгаснай сыстэмы ў перавымбарах саветаў.
6. Аб справаздачна-перавыбарчай кампаніі ў калгасах.
7. Плян падрыхтоўкі калгасных кадраў.

Пачатак а 7 гадз. увечары ў памяшканьні ДОМУ СЕЛЯНІНА.

Прэзыдыум Савету і Праўленьне Калгасцэнтру.

АБВЕСТКА

Даводзіцца да ведама ўсіх арганізацый і грамадзян гор. Менску, што

МЭТАЛЁВЫ ЛОМ (ЖАЛЕЗА),

ЯКІ БУДЗЕ САБРАНЫ

ў дзень суботніка 8 лістапада,

будзе прымацца РУДМЭТАЛЯГАНДЛЕМ

У НАСТУПНЫХ ПУНКТАХ:

1. Склад Рудмэталягандлю (Рэспубліканская, 31).
2. Таварная МББ.
3. 701 варста ля заводу «Энэргія»
4. Загатов. пункт Белдзяржгандлю (Стара-Мясьніцкая, 8).

будзе прымацца выключна

КАЛЯРОВЫ МЭТАЛЬ складам Рудмэталягандлю (Рэспубліканская, 31).

За ўсімі даведкамі зварачацца ў Менскае агенцтва Рудмэталягандлю па тэлефону 11-20.

РУДМЭТАЛЯГАНДАЛЬ.

Да ўвагі ўсіх гаспадарчых, савецкіх, партыйных і праф. арганізацый,

Бюро абслугоўваньня

прымае заказы на газэтныя выразкі з усіх газэт і часопісяй СССР і замежнай прэсы. Выразкі высылаюцца па ўсіх без выключэньня пытаньняў.

КОЖНЫ АДМІНІСТРАТАР, кожны гаспадарнік павінен усебакова ведаць сваю работу.

Падпісвайцеся на газэтныя выразкі

ДЗЕ можна атрымаць любую даведку?

Бюро абслугоўваньня дае даведкі па ўсіх пытаньнях вуснах, пісьмова, па тэлефону і тэлеграфу.

Каб атрымаць усялякія даведкі па тэлефону, трэба быць абанэнтам «БЮРО АБСЛУГОЎВАНЬНЯ».

Выклік па тэлефону без нумару—«БЮРО АБСЛУГОЎВАНЬНЯ СУВЯЗІ». Менск, Ленінская, 34, будынак пошты.

ШВЭЙНЫЯ МАШЫНЫ працоўным



ШВЭЙНЫЯ МАШЫНЫ працоўным

Ашчадкасы БССР з 15 XI г. г. адкрываюць прыём мэтавых укладаў на швэйныя машыны 4-х гатункаў.

1. Ручн. цэнтрабяж. з каўпаком кошт.	82 р.
2. „ з хістаючымся чаўн.	72 р.
3. Нажная цэнтрабяжн. з каўпак.	109 р.
4. „ „ габінэтн.	132 р.

Машыны падзелены на 5 партый:

1-я партыя будзе выдана ў тэрмін з 1-IУ па 30-УI-31 г.
2-я „ „ „ „ з 1-УII „ 30-IX-31 г.
3-я „ „ „ „ з 1-X „ 31-XII-31 г.
4-я „ „ „ „ з 1-I „ 31-III-32 г.
5-я „ „ „ „ з 1-IУ „ 31-У-32 г.

Асобы, якія зьбіраюць сродкі на набыцьцё швэйных машын, павінны назьбіраць на сваім мэтавым рахунку ў ашчадкасе поўны кашт адпаведнага гатунку машыны да наступнага тэрміну:

Набыўшыя машыны 1-й партыі да 31 сакавіка 31 году
„ „ 2-й „ да 30 чэрвеня 31 году
„ „ 3-й „ да 30 верасьня 31 году
„ „ 4-й „ да 31 сьнежня 31 году
„ „ 5-й „ да 31 сакавіка 32 году

Заўкі аб набыцьці машыны і першы ўзнос трэба зрабіць ў любой ашчадкасе на 1-ю, 2-ю і 3-ю партыю да 31-XII 30 г., а на 4-ю і 5-ю партыі—да 1-III-31 году.

Швэйныя машыны маюць права набыць ТОЛЬКІ ПРАЦОЎНЫЯ, пасьля ПАДАЧЫ АДПАВЕДНЫХ ДАВЕДАК ад мясцкомаў, а для сялян—ад сельсаветаў.

Даведкі па пытаньні швэйных машын—у ашчадкасах.

КІРАЎНІЦТВА АШЧАДКАСАМІ БССР.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА)(Рэдакцыя твораў У. ЛЕНІНА

ДА ВЕДАМА ПАДПІСЧЫКАЎ НА ТВОРЫ ЛЕНІНА.

Паведамляем, што ТВОРЫ У. ЛЕНІНА будуць выпушчаны ў наступным парадку:

Т. III—1-XII—1930 г. (Дадатковы тыраж)
Т. V—15-I—1931 г.
Т. IV—1-IV—1931 г.
Т. II—1-V—1931 г.
Т. I—15-VI—1931 г.
Т. VI—1-VIII—1931 г.
Т. VII—1-XI—1931 г.
Т. VIII—1-I—1932 г.

Белдзяржвыдавецтва, рэдакцыя твораў У. Леніна.

АД ПРАЎЛЕНЬНЯ ДЗЯРЖСТРАХУ БССР.

Даводзіцца да ведама страхавацелаў, што на падставе пастановы Савету Працы і Абароны,

СТРАХАВЫЯ ПЛАЦЯЖЫ

па абавязковым акладным страхаваньні за 1930-1931 год

ЛІЧАЦЦА ПЛАЦЯЖАМІ за 1931 г.

(з 1 студзеня па 31 сьнежня 1931 году).

На квартал **кастрычнік-сьнежань** м-цы 1930 году страхавыя плацяжы налічаюцца ў разьмеры **25 проц. гадавога акладу**, за выключэньнем пасеваў (па нормах 1930-1931 году).

Страхавыя плацяжы за асобны квартал павінны быць унесены як у сельскіх мясцовасьцях, так і гарадох:

кулацкімі гаспадаркамі і асобамі, абкладзенымі падаходным падаткам па росьпісу № 3—**не пазьней 1 сьнежня 1930 г.**,

адзіначасобнымі працоўнымі гаспадаркамі—**не пазьней 31 сьнежня 1930 г.**, калгасамі і іншымі каапэратывамі I ступені—**не пазьней 31 студзеня 1931 году.**

На ўнесеныя ў тэрмін плацяжы будуць спаганяцца прымусовым парадкам, з налічэньнем устаноўленай пені.

ПРАЎЛЕНЬНЕ.

Паведамленьні ў чарговынумар „ЗЬВЯЗДЫ“ прымаюцца да 2 гадз. дня

АБ'ЯВА

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ОРГАН ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ

„БЕЛДЗЯРЖСНАБ“

г. Менск, Ленінская, д. Камунбанку.

ЗАБЯСЬПЕЧВАЕ

ўсе прадпрыемствы і будаўніцтва БССР патрэбнымі ім матар'ялямі праз свае склады і транзытам.

МАЕ 4 магазыны ў Менску і аддзяленьні ў Гомелі, Віцебску, Бабруйску і Магілеве и Д.

БЕЛДЗЯРЖСНАБ.

МЯНЯЮ КВАТЭРУ з 3-х пакояў у цэнтры г. Полацку на 2 пакоі ў Менску. Зварачацца па адрасе: Менск, Садовая 8, кв. 3, Судніку.

ХЭМІК-ЛЯБАРАНТ ШУКАЕ ПРАЦЫ. Шырокая 28, кв. 4, Грас

БЕЛАРУСКІ САЮЗ ЖЫЛЬЛЁВАЙ КААПЭРАЦЫІ

„БЕЛЖЫЛСАЮЗ“

Праўленьне, г. Менск, Інтэрнацыянальная, 12.

ТЭЛЕФОНЫ) Старшыня праўленьня . . . . . — 10-50.) Сакратарыят . . . . . — —29.) Арг. аддзел . . . . . — 14-34.

Пры Белжылсаюзе арганізавана

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ БУДАЎНІЧАЯ КАНТОРА

)—(З АДДЗЯЛЕНЬНЯМІ)—(

ў гор. Менску, Гомелі, Віцебску, Воршы, Бабруйску, Магілеве, Полацку, Мазыры, Барысаве і Рэчыцы.

Белбудканторы прымае на сябе **выкананьне розных будаўнічых работ** пераважна жыльлёвых.

Праектнае бюро Белбудканторы прымае на сябе **распрацоўку праектаў, каштарысаў, тэхнічных** разьлікаў і інш.

Галоўнае кіраўніцтва Белбудканторы знаходзіцца ў г. Менску, Інтэрнацыянальная, 12.

Адначасова ў пералічаных вышэй пунктах ёсьць гарадзкія жылсаюзы, якія арганізацыйна абслугоўваюць сетку жыльлёва-арэндных і будаўнічых каапэратываў.

З 1-X-30 г. у г. Менску арганізован **Гаржылсаюз**, які зьмяшчаецца **па Рэвалюцыйнай, 15.**

ДЫНАМІКА РАЗЬВІЦЬЦЯ СЕТКІ.

	На 1-1—25	На 1-1—26	На 1-1—27	На 1-1—28	На 1-1—29	На 1-1—30
ЖЫЛСАЮЗЫ . .	—	6	6	8	8	8
ЖАКТы	9	101	140	126	82	65
ЖСКТ	1	34	71	80	61	53

ДЫНАМІКА РОСТУ ПАЙШЧЫКАЎ

	На 1-1—26	На 1-1—27	На 1-1—28	На 1-1—29	На 1-2—30
На ЖАКТ'ах	5958	8885	11598	12926	15200
„ ЖСКТ .	1745	3207	4214	4350	4750

Сума будаўніцтва ЖСКТ за мінулыя гады . . . 10.150 т. руб.
Вызначана кантрольнымі лічбамі на 1931 г. . . . 3.300 т. „
Выдаткавана на рамонт за мінулы час . . . . 4.830 т. „
Вызначана кантрольнымі лічбамі на 31 г. . . . . 3.000 т. „
Агульная сума будаўніцтва Белбудканторы на 1931 год паводле папярэдніх даных складае . . . 48.000.000 „

БЕЛЖЫЛСАЮЗ.

Друкарня газ. «Зьвязда», Менск.

Менск. Галоўлітбел 337.